Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 192
(26305)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Услед за пісьмом

## «Колькі можна трываць?..»

«Звяртаемся да вас нашым маленькім калектывам, брыгадай мыйшчыц-прыбіральшчыц рухомага саставу 4 тралейбуснага парка, які знаходзіцца на вуліцы Харкаўскай горада Мінска. Праблемы нашы ў наступным. Працуем з шасці гадзін вечара да шасці гадзін раніцы. І ўжо месяц у аварыйным рэжыме. Адміністрацыя прымушае нас выконваць працоўныя абавязкі пад напружаннем 600 В, вакол мокра, з-за павышанай вільготнасці зверху іскраць правады, як бенгальскія агні. Ужо не раз кожную з нас біла токам, так што выходзіш з тралейбуса і не ўсведамляеш, што адбываецца. Парушаюцца нашы правы, элементарныя нормы тэхнікі бяспекі. Акрамя таго, на мыйцы будаўніцтва ў самым разгары: выкананыя катлавіны, сам чорт нагу зверне.

Раней у начную змену працаваў адзін майстар на 10—15 чалавек. Зараз начальства чалавек 5, а нашы праблемы не вырашаюцца. Кажуць: «Патрывайце!». А колькі можна трываць? На дварэ ўжо восень. Ідуць дажджы. Нам у мірны час не хочацца памерці не сваёй смерцю...»

(Заканчэнне на 2-й стар.)

## «ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»

***Руслан ШАЙКІН, спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны»:***

— Літаральна ўчора ў офіс АПБ быў дастаўлены сокал-падарожнік. Гэта здорава і нават цудоўна, калі такія вялікія і элітныя птушкі сустракаюцца ў Беларусі. Да гэтага недзе на працягу 35 гадоў на тэрыторыі нашай краіны ніхто не знаходзіў гнёздаў прыгожага сокала. Падарожнік вельмі рэдка рэгіструецца ў нас падчас сезоннай міграцыі. У жывую сокала-падарожніка я ніколі не бачыў нават здалёк. А тут такі падарунак лёсу... Гэта птушка заляцела ў Мінск, але, мабыць, не зарыентавалася і крыху паранілася. Яе падабралі спецыялісты МНС і перадалі ў дзіцячы цэнтр «Ранак». Там падарожніка падлячылі і накармілі, пасля чаго патэлефанавалі ў офіс АПБ. Мы яе збіраемся акальцаваць і выпусціць на волю, бо зараз сокал ужо цалкам здаровы. Лічу, што гэта вялікая падзея не толькі для мяне асабіста, але і для ўсіх арнітолагаў Беларусі. Спадзяюся, што ў далейшым сокал-падарожнік разам са сваёй другой паловай загняздуецца ў цэнтральным рэгіёне Беларусі, а можа, увогуле колькасць папуляцыі гэтых птушак у нас адновіцца. Справа ў тым, што падарожнік не толькі яркая і прыгожая птушка, але і самы буйны і рэдкі сокал Беларусі. Акрамя гэтага асновай харчавання элітнай птушкі з'яўляюцца галубы і вароны, якіх у гарадах Беларусі стала вельмі шмат. Падарожнікі лічацца натуральнымі біялагічнымі рэгулятарамі колькасці ўрбанізаваных птушак.



*Сокал-падарожнік у руках Руслана ШАЙКІНА і метадыста дзіцячага цэнтра «Ранак» Алены ПАЎЛОЎСКАЙ.*

***Аксана КАСТУНОВА, эканаміст першай катэгорыі Пріорбанка:***

— Назіраю цудоўную восень за акном свайго працоўнага кабінета. Наша аддзяленне знаходзіцца побач з паркам імя Чалюскінцаў, таму час ад часу фіксую, як пад дрэвам бегаюць вавёркі-брунеткі. Спадзяюся, што з цягам часу змагу рэалізаваць свае новыя праекты і смелыя планы. Збіраюся атрымаць трэцюю вышэйшую адукацыю. Цяпер рыхтуюся да паступлення ў інстытут дзяржаўнай службы. Месяц таму вярнулася з турпаездкі ў Егіпет, дзе цудоўна адпачывала з сынам і сябрамі.

АБРЫСЫ АЙЧЫНЫ

## Час насення і вяселляў

**Ёсць мясціны на нашай зямлі, самім Богам пацалаваныя. Усё ім дадзена — чароўная прырода, урадлівая зямля і залатыя рукі. Каб праводзіліся рэйтынгі сярод гарадоў, я аддаў бы перавагу Давыд-Гарадку. І гэта пацвердзяць некалькі сёлетніх публікацый на старонках «Звязды» пра паўднёвы палескі горад на беразе Гарыні, дзе яшчэ так шмат праяў захаванасці старажытных традыцый, умення і жадання працаваць, будаваць свой дом, ладзіць святы і заўсёды заставацца самімі сабой. Калі ж уважліва паглядзець на карту паўднёвай беларускай ускраіны, Давыд-Гарадок — адзін з крайніх прыгранічных населеных пунктаў Брэстчыны, нягледзячы на тое, што да мяжы з Украінай трэба праехаць праз так званыя Мерлінскія хутары і яшчэ добрыя паўсотні кіламетраў.**

(Заканчэнне на 6-й стар.)



*Насенне сальвіі на далоні гарадчанкі-кветкавода.*



*Валянціна РЫМАР і яе дачка Наталля за зборам насення астры.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі з 30-годдзем архіерэйскага служэння на беларускай зямлі

«Вы сталі ля вытокаў адраджэння Праваслаўя на Беларусі. Вашай працай і малітвамі ва ўсёй паўнаце аднаўлена царкоўнае жыццё, аднаўляюцца і будуюцца храмы, заснаваны новыя манастыры, утвораны брацтвы і нядзельныя школы, шырокія маштабы набывае асветніцкая і дабрачынная дзейнасць», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт адзначыў, што сёння Беларуская Праваслаўная Царква займае дастойнае месца ў жыцці краіны, садзейнічае дасягненню сацыяльнага дабрабыту і стабільнасці. На думку Аляксандра Лукашэнкі, маральныя ідэалы Праваслаўя ўсё ў большай ступені становяцца духоўнай сілай людзей, дапамагаюць падтрымліваць мір і згоду на нашай зямлі.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў Мітрапаліту Філарэту здароўя, плённай працы, далейшых здзяйсненняў у імя Праваслаўя і Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания сварочно-слесарного отделения, общ. пл. 949,9 кв.м, расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Замковая, 19. Начальная цена – 378 707 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены, перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Отвод земельного участка будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **11.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **10.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует, что
**с 13 октября 2008 года**
начинает прием денежных средств на
**новый срочный банковский вклад**
в белорусских рублях и иностранной валюте (долларах США и евро)
**«Престиж».**

- Срок хранения вклада — 3 месяца.
- Фиксированная ставка - в белорусских рублях — 15 % годовых, - в иностранной валюте — 10 % годовых.
- Ежемесячная капитализация дохода и возможность его выплаты.
- Минимальная сумма для открытия вклада в белорусских рублях — 100 000 рублей, в иностранной валюте — сумма не ограничена.
- Вклад вносится наличными денежными средствами либо безналичным перечислением в белорусских рублях, долларах США или евро.
- Вклад может быть открыт на имя другого лица.

*Будем рады видеть Вас клиентами ОАО «АСБ Беларусбанк».*

*Дополнительную информацию по размещению денежных средств на банковские вклады можно получить в любом учреждении банка или на сайте банка*

http://www.belarusbank.by

**Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей.**

| | январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вклады до востребования | 20,3 | 62,4 | 149,7 | 238,4 | 148,6 | 193,3 | 202,6 | 233,2 | 244,1 | 365,5 | 397,0 | 29 577,5 | 31 832,6 |
| в том числе: в белорусских рублях | 19,4 | 59,3 | 146,3 | 234,1 | 142,4 | 187,7 | 196,5 | 222,2 | 237,7 | 355,5 | 388,0 | 29 408,3 | 31 597,5 |
| в иностранной валюте | 0,9 | 3,1 | 3,4 | 4,3 | 6,2 | 5,6 | 6,1 | 11,0 | 6,4 | 10,0 | 9,0 | 169,2 | 235,1 |
| Срочные депозиты | 30 358,5 | 32 352,4 | 24 405,4 | 38 746,0 | 48 555,5 | 31 125,0 | 54 036,6 | 38 911,9 | 30 223,7 | 55 111,0 | 42 713,9 | 52 150,6 | 478 690,4 |
| в том числе: в белорусских рублях | 26 895,8 | 28 068,5 | 20 038,5 | 29 455,9 | 42 531,2 | 25 248,9 | 42 908,6 | 32 018,1 | 23 385,1 | 42 826,4 | 34 573,9 | 35 011,8 | 382 962,8 |
| в иностранной валюте | 3 462,7 | 4 283,9 | 4 366,9 | 9 290,1 | 6 024,3 | 5 876,1 | 11 128,0 | 6 893,8 | 6 838,6 | 12 284,6 | 8 140,0 | 17 138,8 | 95 727,6 |

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

Акцыя «Звязды»

## ПАВАЖАНЫЯ БЕЛАРУСЫ, ПАМЯТАЙЦЕ ЗВАННЕ СВАЁ!

Наш свет поўны дзіваў і парадоксаў. Ці не з'яўляецца адным з іх тое, што ў мітусні грамадскага транспарту, недзе паміж стомленай жанчынай і цяжкой, пахнучай свежым хлебам, торбай чатырохгадовае дзіця ўпершыню ўсведамляе сябе беларусам.

Адбываецца гэта, дзякуючы мове, якая гучыць у сталічным транспарце. Для большасці сталічных дзетак, у якіх не засталося ў вёсках бабуль, такое самаўсведамленне — звычайная справа. Па той жа прычыне замежны госць, той жа расіянін, адчуе, што ён — у Беларусі, і нават запомніць кароткую, але мілагучную фразу: «Асцярожна, дзверы зачыняюцца!» Ды і сам беларус, адарваны ад роднага моўнага асяроддзя, у віры штодзённых клопатаў забыўшыся на беларускую кніжку, праз гэтыя кароткія аб'явы калі-нікалі сагрэе душу амаль забытым словам, якое хочацца пакатаць у роце, прамовіць уголас самому: «Не прыхінайцеся! Будзьце пільнымі!»

Цяпер здаецца, што так было заўсёды. Але ж, не. У сталічным наземным грамадскім транспарце беларуская мова з'явілася ў назвах, на бягучых радках і загучала з мікрафонаў усяго толькі гады тры таму.

— Гэта была ініцыятыва генеральнага дырэктара Лявонція ПАПЯНКА, — тлумачыць намеснік генеральнага дырэктара Транспартнага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінсктранс» Уладзімір КАНОПЧАНКА. — Але гэта не з'яўляецца нечым асаблівым, нейкім прынцыпам або абсалютам. Гэта нават не прыкмета патрыятызму. Проста — наша работа. Дзяржаўныя мовы ў нас дзве і мы з павагай ставіліся да абедзвюх. Гады тры таму было вырашана, што ў сталічным транспарце павінна гучаць тытульная мова нацыі. Гэта — своеасаблівая візітка сталіцы Беларусі. Усе аб'явы, назвы прыпынкаў, інфармацыйныя паведамленні ў мінскіх аўтобусах, тралейбусах і трамваях гучаць па-беларуску.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Нягледзячы на тое, што гэта патрабуе дадатковых клопатаў і часу. Бо спярша практычна ўся інфармацыя з'яўляецца па-руску, і яе трэба перакласці. Гэту работу выконваюць супрацоўнікі ведамаснай газеты «Транспортник столицы». Часцей за ўсё па пераклад звяртаюцца да карэспандэнтаў І катэгорыі Тамары МАРОЗАВАЙ і Кацярыны СТАРАВОЙТАВАЙ.

— Газета наша двухмоўная, аднак асноўныя матэрыялы ідуць на рускай мове, на беларускай мы публікуем артыкулы пазаштатных карэспандэнтаў альбо дасланыя на старонку «Творчество наших читателей» вершы і апавяданні, — тлумачыць галоўны рэдактар газеты Ірына МАРКОВІЧ. — Тым не менш, мы перакладаем на беларускую мову ўсе інфармацыйныя тэксты «Мінсктранса», а таксама, калі трэба, унутраныя дакументы.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Аўтарытэтна

## Пётр НІКІЦЕНКА: «НЕАБХОДНА АРЫЕНТАВАЦЦА НА ПРЫЦЯГНЕННЕ НЕ КРЭДЫТАЎ І ПАЗЫК, А ПРАМЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ»



**Актуальная тэма сённяшняга дня — распаўсюджванне на ўсю сусветную эканоміку фінансавага крызісу. Супрацьяддзе, якое зараз ужо сумеснымі намаганнямі шукаюць фінансісты многіх краін, пакідае надзею, што міжнароднае супрацоўніцтва ў гэтай справе дасць плён. Літаральна днямі, калі прыняты план Мінфіна ЗША па выратаванні банкаўскай сістэмы не панізіў «тэмпературу» на рынках, цэнтрабанкі шэрагу краін пайшлі не беспрэцэдэнтны крок — адначасова знізілі ўліковыя стаўкі на 0,5 працэнта. Як адзначаюць некаторыя эксперты, магчыма, прынятых мераў і не хопіць на ўрэгуляванне сітуацыі ў фінансавым сектары, але, напрыклад, учора фондавыя таргі ў шэрагу краін, у тым ліку і Расіі, адкрыліся павышэннем вядучых індэксаў.**

У ЗША ж, між іншым, вельмі разлічваюць на міжнароднае супрацоўніцтва ў барацьбе з фінансавым крызісам. І яшчэ разлічваюць на аптымістычны сцэнарый. У прыватнасці, кіраўнік Мінфіна ЗША Генры Полсан заявіў пра тое, што Злучаныя Штаты справяцца з цяперашнім выклікам, аднак папярэдзіў, што не выключае новых банкруцтваў у сістэме фінансавых інстытутаў і «неабходна набрацца цярпення, паколькі патрасенні хутка не скончацца».

Сваё меркаванне наконт цяперашняй сітуацыі мы папрасілі выказаць **старшыню грамадскага навукова-эканамічнага савета пры «Звяздзе», дырэктара інстытута эканомікі НАН Беларусі, акадэміка Пятра НІКІЦЕНКУ.** Зразумела, пытанне, якое мы ніяк не маглі абысці, — як сусветныя падзеі могуць паўплываць на нашу краіну? І, галоўнае, пра што хацелі пачуць — як Беларусі мінімізаваць наступствы ад таго, што хвалюе цяпер увесь свет?

— Крызіс сусветных фінансавых рынкаў, пачаткам якога паслужылі ваенная эканоміка і крызіс іпатэчнага крэдытавання ў ЗША, можа мець негатыўныя наступствы для фінансавых сектараў эканомік, якія сталі на шлях развіцця, уключаючы Беларусь, — гаворыць Пётр Нікіценка. — Сусветны крызіс вядзе да абясцэньвання валют і імпарту інфляцыі ў нашу краіну. У выніку рост індэкса спажывецкіх цэнаў у жніўні гэтага года да жніўня 2007 года склаў 116,2 працэнта. **Забеспячэнне станоўчых працэнтных ставак па ўкладах павінна стаць адной з асноўных мераў** для папярэджання адтоку грашовых сродкаў з дэпазітаў і паслаблення фінансавай базы банкаў.

**— Пётр Георгіевіч, што датычыцца тых краін, з якімі Беларусь гандлюе, і якіх ужо закранулі сусветныя падзеі: што будзе тут, на ваш погляд, адбывацца далей?**

— Асноўны гандлёвы партнёр Беларусі — Расія ўжо адчувае ўплыў крызісу: назіраецца адток капіталаў з краіны, падзенне біржавых каціровак акцый. У гэтай сувязі **магчымае часовае зніжэнне попыту на беларускія тавары на расійскім рынку, што стане стрымліваючым фактарам развіцця вядучых беларускіх экспарцёраў і імпарцёраў.** Аднак, маючы самы высокі ўзровень ліквіднасці ў свеце — нацыянальнае багацце, расійскі рубель у бліжэйшай перспектыве ўвойдзе ў склад самых надзейных валют свету, таму беларускім экспарцёрам і імпарцёрам не трэба рабіць якіх-небудзь дзеянняў па сыходзе з зоны расійскага рубля.

Крызіс ліквіднасці ЗША на сусветных рынках будзе аказваць праз долар уплыў на фінансавую сферу Беларусі. Інфляцыя фінансавых рэсурсаў на сусветным рынку прывядзе да росту выдаткаў на абслугоўванне і беларускага знешняга доўгу. Гэта можа стварыць перадумовы для крызісу ліквіднасці ў краіне. Таму ў будучыні, у першую чаргу, **неабходна арыентавацца на прыцягненне не крэдытаў і пазык, а прамых інвестыцый,** якія не павялічваюць дзяржаўны знешні доўг. Дзяржаўныя аблігацыі і карпаратыўныя каштоўныя паперы маглі б стаць найлепшай крыніцай прыцягнення капіталу ў рэспубліку, у адрозненне ад замежных крэдытаў. Акрамя таго, мэтазгодна арыентавацца на імпарт інавацыйных ліцэнзій і тэхналогій па вытворчасці канкурэнтаздольных вырабаў для экспарту і імпартазамяшчэння.

**— Пётр Георгіевіч, у Расіі былі зроблены пэўныя крокі для падтрымання стабільнасці фінансавай сістэмы: «падушкі бяспекі» ў выглядзе Рэзервовага фонду і Фонду нацыянальнага дабрабыту дазваляюць там не панікаваць банкірам. А як у нас?**

— У разрэзе банкаўскай сістэмы крызіс можа мець комплекс негатыўных праяўленняў — падзенне ліквіднасці, скарачэнне рэсурснай базы, рост знешняй запазычанасці, страта ўласнага капіталу. Ва ўмовах эскалацыі пагрозы крызісу ліквіднасці асаблівую важнасць набывае праблема павышэння ўзроўню капіталізацыі беларускай банкаўскай сістэмы.

Сукупны статутны фонд камерцыйных банкаў складаў на 1 ліпеня гэтага года ўсяго 5,1 трыльёна рублёў, альбо прыкладна 2,4 мільярда долараў. Такі ўзровень капіталізацыі ва ўмовах сусветнага крызісу можа аказацца недастатковым для забеспячэння стабільнага функцыянавання і развіцця банкаўскай сістэмы, пакрыцця рызык у дзейнасці банкаў. У выпадку немагчымасці папаўнення банкамі ліквіднасці ў неабходным аб'ёме могуць узнікаць наступныя негатыўныя наступствы: крызіс неплацяжоў, які выяўляецца ў несвоечасовым выкананні абавязацельстваў перад сваімі контрагентамі; праблемы з запазычваннем камерцыйнымі банкамі грашовых сродкаў на рынку міжбанкаўскага крэдытавання; рэзкі адток укладчыкаў (фізічных і юрыдычных асобаў) з датэрміновым зняццем укладаў і дэпазітаў; страта цікавасці замежных інвестараў да ўкладанняў у банкаўскі сектар Беларусі.

**Для забеспячэння неабходных аб'ёмаў фінансавых рэсурсаў неабходна далейшая капіталізацыя банкаўскага сектара, у тым ліку за кошт прыцягнення ў яго пераважна расійскага і кітайскага капіталаў.** (Даведка: на 01.09.2008 г. доля замежнага капіталу ў сукупным статутным фондзе беларускіх банкаў склала 22,2 працэнта, ва Украіне — 35 працэнтаў, у Расіі — 25,7 працэнта). Станоўчым момантам павелічэння долі згаданых капіталаў у статутных фондах банкаў з'яўляецца магчымасць прыцягнення такімі банкамі рэсурсаў напрамую ад мацярынскіх банкаў. Гэта больш выгадна ў параўнанні з пакупкай рэсурсаў на міжбанкаўскім рынку гэтых і іншых замежных валют.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

04 ноября 2008 г.
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2-этажного кирпичного здания механического цеха, об. пл. 1433,4 кв.м, расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Волынца, д. 12. Начальная цена – 1 215 000 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,1073 га.

Контактный телефон: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже недвижимого имущественного комплекса –**
**ЗДАНИЙ И СООРУЖЕНИЙ ЧЕРИКОВСКОГО ПЛОДОКОНСЕРВНОГО ЗАВОДА,**
**расположенного по адресу:**
**Могилевская обл., г. Чериков, ул. Ленинская, 1**

Частное унитарное предприятие «Чериковский плодоконсервный завод» (Продавец) совместно с ЧУП «Белкоопроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущественного комплекса – зданий и сооружений Чериковского плодоконсервного завода, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Чериков, ул. Ленинская, 1.

Начальная цена снижена на 20 % и составляет 978 450 230 белорусских рублей с НДС.

Размер задатка составляет 3 % от начальной цены, сумма задатка 29 353 507 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 14-08 от 09.10.2008 г., без НДС»).

Аукцион состоится **28.10.2008 года в 14.00** по адресу: г. Чериков, ул. Ленинская, 1, здание заводоуправления, 2-й этаж, актовый зал.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.10.2008 г.** включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 14-08 от 09.10.2008 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 1 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 3-х рабочих дней с даты проведения аукциона.

Условия оплаты – разовый платеж.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от ЧУП «Чериковский плодоконсервный завод» к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Объект продается без условий.

Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 160 от 27.08.2008 г.

Контактные телефоны:
(8017) 226 78 84; 226 94 83.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 114,00 |
| 1 еўра | 2 905,27 |
| 1 латвійскі лат | 4 095,31 |
| 1 літоўскі літ | 841,21 |
| 1 чэшская крона | 118,32 |
| 1 польскі злоты | 844,76 |
| 1 расійскі рубель | 81,09 |
| 1 украінская грыўня | 393,67 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,0695 |
| 10 UAH | 45,9374 |
| 1000 BYR | 12,3348 |
| EUR | 35,6839 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 09.10.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

## Аляксандр Лукашэнка наведае Кыргызстан з афіцыйным візітам і прыме ўдзел у самітах СНД і ЕЎрАзЭС у Бішкеку

У Бішкеку 10 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі прыме ўдзел у пасяджэннях Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД і Міждзяржаўнага савета Еўразійскага эканамічнага супольніцтва. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Лідары краін СНД разгледзяць перспектывы эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, забеспячэнне бяспекі і праблемы аптымізацыі работы Садружнасці. У прыватнасці, парадак дня ўключае абмеркаванне праекта Стратэгіі эканамічнага развіцця СНД на перыяд да 2020 года, пытання аб вызначэнні супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі ключавой сферай узаемадзеяння дзяржаў — удзельніц СНД у 2009 годзе, Плана асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і святкаванні 65-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў.

Таксама трэба будзе разгледзець пытанні ўмацавання Садружнасці як міжнароднай арганізацыі.

У рамках афіцыйнага візіту 11 кастрычніка кіраўнік беларускай дзяржавы правядзе двухбаковыя перагаворы з Прэзідэнтам Кыргызскай Рэспублікі Курманбекам Бакіевым, па выніках якіх плануецца падпісанне дакументаў, накіраваных на пашырэнне дагаворна-прававой базы ўзаемадзеяння ў розных сферах супрацоўніцтва.

**БЕЛТА.**

## Бюджэтная прыбаўка — з лістапада

**Пастановай Савета Міністраў ад 5 кастрычніка № 1449 у Беларусі вызначана новая тарыфная стаўка I разраду для бюджэтнікаў і работнікаў арганізацый, што карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі. З 1 лістапада памер тарыфнай стаўкі I разраду павялічыцца з 73 да 91 тыс. рублёў.**

Як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка, у цэлым намінальная зарплата бюджэтнікаў павялічыцца на 21 працэнт. Пры гэтым найбольшую прыбаўку (24 працэнты) атрымаюць нізкааплатныя катэгорыі работнікаў. Дарэчы, змяненне тарыфнай стаўкі будзе датычыцца прыкладна 800 тысяч работнікаў. Пры гэтым, нагадала Галіна Трафіменка, сёлета гэта будзе ўжо другая «прыбаўка» бюджэтнікам.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Нацбанк Беларусі не выключае магчымасці павышэння стаўкі рэфінансавання ў бліжэйшы час

Нацыянальны банк Беларусі не выключае магчымасці павышэння стаўкі рэфінансавання ў бліжэйшы час. Аб гэтым паведаміў журналістам першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка Павел Калаур.

«Мы плануем разгледзець магчымасць змянення стаўкі рэфінансавання ў бліжэйшы час. Пакуль складана сказаць, якое канкрэтна рашэнне будзе прынята. Але зразумела адно: Нацбанк не будзе рабіць рэзкіх рухаў. Для гэтага няма ніякіх падстаў і перадумоў», — падкрэсліў ён.

Разам з тым Павел Калаур адзначыў, што «цяпер якіх-небудзь падстаў для зніжэння стаўкі рэфінансавання ў Беларусі няма». Таму яна, хутчэй за ўсё, будзе павышана. Калі гэта адбудзецца, то павышэнне будзе нязначным, таму што макраэканамічная сітуацыя ў краіне стабільная. Растлумачваючы прычыну магчымага павелічэння стаўкі, першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка падкрэсліў, што ўзровень інфляцыі ў Беларусі пакуль складваецца крыху вышэйшы, чым прагназаваўся, таму працэнтная палітыка Нацбанка павінна адэкватна рэагаваць на гэтыя змяненні інфляцыйнага ціску.

Як паведамлялася, індэкс спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі ў студзені—жніўні гэтага года да снежня 2007-га склаў 108,3 працэнта. Стаўка рэфінансавання з 13 жніўня гэтага года была павышана на 0,25 працэнтнага пункта да 10,5 працэнта гадавых.

**БЕЛТА.**

## Ганаровая ўзнагарода

У Беларусі сёлета ордэнам Маці ўзнагароджаны 369 жанчын, якія нарадзілі і дастойна выхавалі 5 і больш дзяцей. Усяго ордэнам Маці ўзнагароджаны 5 тыс. 758 жанчын. У адпаведнасці з указам Прэзідэнта з 2006 года пры ўзнагароджанні ордэнам Маці выплачваецца сума ў памеры пяцiразовага бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Акрамя таго, у рэгіёнах устаноўлены розныя формы заахвочвання ўзнагароджаных гэтым ордэнам.

# «КОЛЬКІ МОЖНА ТРЫВАЦЬ?..»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

7 кастрычніка а 18-й гадзіне, калі карэспандэнты разам з прадстаўнікамі Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы наведалі тралейбусны парк № 4, мыйка, якая сапраўды знаходзілася ў стадыі рэканструкцыі, не працавала.

«Сёння першы дзень, як мыйка не працуе, — гавораць мыйшчыцы-прыбіральшчыцы. — Нам сказалі заўтра выйсці на працу ўдзень. Дзе будзем мыць тралейбусы, яшчэ не ведаем...»

**Каментарый дырэктара філіяла тралейбуснага парка № 4 Барыса ДЗЕМІДОВІЧА:**

«Зараз на тэрыторыі парка будуецца станцыя дыягностыкі і адначасова вядзецца маштабная рэканструкцыя мыйкі: ад падлогі да столі. Плануецца ўсталяваць тут ачышчальныя збудаванні абаротнага водазабеспячэння. Бо ўвесь гэты час парк падчас мыйкі тралейбусаў зліваў усю ваду ў гарадскую каналізацыю. Новае абсталяванне зменшыць расход вады практычна ў 10 разоў. Пасля завяршэння рэканструкцыі — плануем завяршыць да новага года — палепшацца і ўмовы працы людзей.

Мы зачынілі мыйку. Але гэта не значыць, што тралейбусы будуць хадзіць па горадзе брудныя. Мыць транспарт ніхто не адмяняў. Зараз шукаем альтэрнатыўнае месца, дзе нашы работнікі маглі б прыводзіць у належны стан тралейбусы. Магчыма, гэта будзе мыйка, якая знаходзіцца на тэрыторыі тралейбуснага парка № 3.

На гэтым тыдні, пакуль яшчэ не прыціснулі маразы, часовым працоўным месцам стане пляцоўка ля гаража. Мыць тралейбусы давядзецца пад адкрытым небам пры дапамозе невялікага апарата для мыйкі.

Да канца тыдня будзем спрабаваць вырашыць і пытанне з бытоўкай. Мы разумеем, што ў работніц павінен быць пакой, дзе можна пераапрануцца, памыць рукі пасля работы, пасушыць рабочае адзенне.

Акрамя таго, у сувязі з пагаршэннем умоў працы для паляпшэння маральнага клімату ў калектыве аплата працы работніц будзе павышана. Так, з 1 кастрычніка кожная з іх будзе атрымліваць на 100 тысяч рублёў больш».

**На наступны дзень я звязалася па тэлефоне з Марыяй ЛЯЎЧУК, якая працуе ў чацвёртым тралейбусным парку ажно 18 гадоў.**



*«Дырэктар, прыміце меры, калі ласка. У такіх умовах працаваць немагчыма. Ідзеш на работу і не ведаеш, ці вернешся назад жывым і здаровым. У нас жа ва ўсіх ёсць дзеці...»*

— Сёння мыем на вуліцы, пры дапамозе невялікай мыйнай машыны, якая прызначана для мыцця колаў тралейбусаў, — расказала жанчына. — Дзякуй богу, што хоць цёплай вадой забяспечылі. Сказалі нам выходзіць на работу і днём, бо ў сувязі з закрыццём мыйкі мы за змену не паспяваем вымыць усе тралейбусы. Бытоўку папрасілі таксама вызваліць, да канца тыдня будзем пераапранацца ў гардэробе. А вось сушыць вопратку пакуль што давядзецца дома... Спадзяёмся, што кіраўніцтва, як мага хутчэй знойдзе выйсце з сітуацыі.

**Каментарый начальніка Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Сяргея ТКАЧОВА:**

— Сітуацыя, якая склалася ў мінскім тралейбусным парку № 4, неардынарная. Калі я прачытаў ліст, які прыйшоў у газету «Звязда», то на ўласныя вочы вырашыў пераканацца ў напісаным. За той непрацяглы час, што я працую ў інспекцыі, паспеў наведаць шэраг прадпрыемстваў і арганізацый «Мінсктранса». Сур'ёзных парушэнняў у іх дзейнасці не было выяўлена. Таму я неаднаразова ставіў іх у прыклад іншым, у прыватнасці, будаўнічым арганізацыям.

Калі ж прыехалі на аб'ект — мыйка знаходзілася ў не рабочым стане. Кіраўніцтва прадпрыемства, думаю, разумела, што аб парушэннях стане вядома, таму і прыняло, хоць і са спазненнем, меры — прыпыніла дзейнасць аб'екта.

Адназначна магу сказаць, што ў такіх умовах, у якіх давялося працаваць аўтарам скаргі, працаваць ні ў якім разе нельга. Любы работнік ведае ці павінен ведаць, праходзячы інструктаж, што ніхто не мае права прымусіць працаваць у небяспечных для жыцця ўмовах. І, тым больш, ніхто не можа ў гэтым выпадку прад'яўляць штрафныя санкцыі за невыкананне працоўных абавязкаў. Калі ж ваш непасрэдны начальнік не можа ці не хоча вам дапамагчы, то трэба неадкладна звярнуцца са сваёй праблемай непасрэдна да дырэктара прадпрыемства ці арганізацыі. А работнікі пабаяліся звярнуцца да дырэктара, а адразу ж напісалі ліст у газету. Я думаю, калі б жанчыны адразу ж звярнуліся да дырэктара ці ў вышэйстаячую арганізацыю да генеральнага дырэктара, то праблема была б вырашана значна хутчэй.

Будзем трымаць сітуацыю на кантролі, каб у бліжэйшы час там былі прыняты пэўныя меры па стварэнні бяспечных і прымальных умоў працы для прыбіральшчыц.

*— Як часта да вас паступаюць звароты работнікаў, якія незадаволены ўмовамі працы?*

— Паступаюць, але не вельмі часта. Як правіла, парушэнні рознага роду мы выяўляем самі падчас праверак. Прынамсі, за 9 месяцаў гэтага года Мінскім гарадскім упраўленнем Дэпартамента інспекцыі працы праверана 1666 арганізацый, што значна больш, чым летась. У тым ліку наведалі і 566 арганізацый, якім раней былі выдадзены нашы прадпісанні. Падчас рэйдаў выдалі новыя 1124 рэкамендацыі для ўстаранення тых ці іншых парушэнняў. Забаранілі работу на 215 аб'ектах, якія стваралі пагрозу жыццю і здароўю работнікаў, спынілі работу 199 машын і станкоў. 15 участкаў і адзін цэх былі закрыты і не эксплуатаваліся да таго часу, пакуль не былі ліквідаваны тыя ці іншыя парушэнні. Прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці больш чым тысячу кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. У сувязі з гэтым больш як 700 мільёнаў рублёў паступіла ў мясцовы бюджэт за кошт штрафных санкцый.

Больш за ўсё парушэнняў сёння на будаўнічых аб'ектах горада. За 9 месяцаў гэтага года на будаўнічых пляцоўках загінулі 10 чалавек, 30 — атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. Гэта вялікія лічбы, на якія нельга заплюшчваць вочы. Таму праверкам у гэтай галіне мы надаём сёння шмат увагі. Акрамя планавых праверак, праводзім аператыўныя мэтавыя выезды. Апошняя такая праверка была праведзена ў канцы верасня на будаўнічых аб'ектах Фрунзенскага раёна. У выніку былі выяўлены грубыя парушэнні. І гэта не адзіная пазапланавая праверка. Калі я ці мае супрацоўнікі ідучы, напрыклад, на абед, прыкмецілі нейкія парушэнні, то, незалежна ад таго, маецца праверка гэтага аб'екта ў плане ці не, мы яго абавязкова наведаем...

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



*Крыніцай праблем прыбіральшчыц сталі будаўнічыя работы, якія вядуцца на тэрыторыі тралейбуснага парка № 4.*





*«Яшчэ некалькі дзён таму гэтыя агаленыя шчыткі былі пад напружаннем ў 220 В. А з вялікага шчыта ляцелі іскры, пакуль яго не прыкрылі гумавым дыванком».*

# «НЕАБХОДНА АРЫЕНТАВАЦЦА НА ПРЫЦЯГНЕННЕ НЕ КРЭДЫТАЎ І ПАЗЫК, А ПРАМЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Павышэнню інвестыцыйнай актыўнасці банкаў за кошт павелічэння долі доўгатэрміновых дэпазітаў магла б спрыяць і дыферэнцыяцыя працэнтных адлічэнняў у фонд абавязковых рэзерваў у залежнасці ад тэрмінаў прыцягнення рэсурсаў банкамі.

**— Якім чынам закране нашу эканоміку тое, што адбываецца з коштам энерганосьбітаў на сусветных пляцоўках, у прыватнасці, з цэнамі на нафту і нафтапрадукты?**

— Зніжэнне сусветных цэнаў на нафту і нафтапрадукты, якія складаюць больш за трэць усяго экспарту краіны, — адзін з негатыўных фактараў для беларускай эканомікі. У выніку **трэба чакаць не толькі змяншэння валютнай выручкі, але і скарачэння паступлення ў бюджэт экспартных пошлін на нафтапрадукты, памер якіх прывязаны да сусветных цэнаў на нафту.** Акрамя таго, на фоне крызісу на сусветных фінансавых рынках ужо выявілася тэндэнцыя падзення цэнаў на азотныя і фосфарныя ўгнаенні. Таму не выключана зніжэнне цэнаў на калійныя ўгнаенні, якія таксама з'яўляюцца значнай крыніцай беларускага экспарту.

У сувязі з гэтым **трэба чакаць зніжэння тэмпаў росту даходаў бюджэту ад знешняга гандлю,** доля якіх у бюджэце краіны ў апошнія гады ўзрасла. Гэта акалічнасць прад'яўляе да фінансавай сістэмы дадатковыя патрабаванні па забеспячэнні ўстойлівасці даходаў банкаўскай і бюджэтнай сістэм. Пры іншых роўных магчымасцях, чым вышэйшая доля даходаў ад кан'юктурна нестабільных крыніц, тым больш няўстойлівыя даходы гэтых сістэм. Таму адным з асноўных напрамкаў умацавання стабільнасці фінансавай сістэмы Беларусі павінна стаць далейшая лібералізацыя фінансава-бюджэтнай палітыкі і ўдасканаленне гаспадарчага механізма, які здольны забяспечыць далейшы рост ВУП, зарплаты і пенсій людзей, якія занятыя прадукцыйнай працай.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Беларускі дзяржаўны тэатр лялек з 70-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек з 70-годдзем з дня заснавання тэатра. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«На працягу ўсёй сваёй гісторыі старэйшы лялечны тэатр краіны паспяхова вырашае важнейшыя эстэтычныя і выхаваўчыя задачы, адкрывае падрастаючаму пакаленню чароўны свет мастацтва, дастойна прадстаўляе Беларусь на прэстыжных міжнародных фестывалях, дорыць маленькім і дарослым гледачам радасць, надзею і веру ў дабро», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўражальныя творчыя вынікі дасягнуты дзякуючы нястомнай працы цудоўнага калектыву, які аб'ядноўвае таленавітых, мэтанакіраваных і адданых сваёй справе людзей. Нездарма сёлета яму прысвоена ганаровае званне заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь.

«Няхай і ў далейшым ваша работа будзе такой жа натхнёнай і плённай, накіраванай на развіццё беларускай культуры», — пажадаў Прэзідэнт калектыву тэатра.

**БЕЛТА.**

## Абзац

■ ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» анулявала дазвол на выкананне гарадскіх і прыгарадных аўтамабільных перавозак пасажыраў у г. Мінску, выдадзены прыватнаму прадпрыемству «ЛайнАўтаБел» на маршрут № 1029-Т «Ст. м. Акадэмія навук — Сухарава-6» і НП ТАА «Фаўна-2002» на маршруты № 1117-Т «Вакзал (вул. Кірава) — п. Ждановічы», № 1404-Т «ДС Дружная — ДС Малінаўка-4», № 1416-т «Дом друку — ГЦ Ждановічы» і « 1420-Т «Сярова — Матусевіча — ГД Ждановічы». Перавозкі па экспрэсных маршрутах № 1029-Т, 1117-Т, 1404-Т і 1416-Т забаронены з 25 верасня гэтага года, а па экспрэсным маршруце № 1420-Т — з 9 верасня гэтага года.

■ **У дарожна-транспартным здарэнні ў Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці 2 чалавекі загінулі, 5 атрымалі раненні, паведамілі БЕЛТА ў ДАІ МУС Беларусі. Аўтамабіль «Рэно», у якім ехалі 7 чалавек, перакуліўся на прамым участку дарогі Віцебск — Полацк. Дзяўчына 1991 года нараджэння і хлопец 1986 года нараджэння загінулі. Пацярпелыя дастаўлены ў бальніцу. Усе яны маладыя грамадзяне Беларусі.**

## Поўны абзац

■ Італьянскім школьнікам у рамках эксперыменту на год заменяць падручнікі партатыўнымі камп'ютарамі. Шэсцьдзесят вучняў ва ўзросце ад 8 да 10 гадоў у адной са школ Турына будуць выкарыстоўваць замест кніг невялікія ноўтбукі. Прылады важаць менш за кілаграм, іх можна кідаць з вышыні 1,5 м і яны воданепранікальныя. Доступ школьнікаў у інтэрнэт абмежаваны спецыяльнай праграмай. Аўтары эксперыменту спадзяюцца, што пры дапамозе праекта ўдасца значна скараціць расходы на навучанне. Цана ноўтбука складае 400 долараў, у той час як падручнікі абыходзяцца ў 700 долараў штогод.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПУЦІН АДМОВІЎСЯ ЗВАЛЬНЯЦЬ МІНІСТРА ФІНАНСАЎ



**Лідар КПРФ Генадзь Зюганаў на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Уладзімірам Пуціным папрасіў яго звольніць віцэ-прэм'ера і міністра фінансаў Аляксея Кудрына, аднак атрымаў адмову. Паводле слоў Пуціна, у рабоце эканамічнага блока ўрада ёсць плюсы, а мінусы падчас крызісу ён абмяркоўваць не будзе. Аб гэтым паведамляе агенцтва Reuters.**

Як лічыць лідар расійскіх камуністаў, курс Аляксея Кудрына аказаўся правальным, а сам міністр фінансаў не справіўся са сваёй задачай. Акрамя таго, Зюганаў звярнуў увагу на тое, што Мінфін недафінансоўвае шэраг мэтавых праграм. «Праваленыя ўсе праграмы, а цяпер можна прыкрывацца любымі меркаваннямі, у тым ліку і фінансавым землятрусам», — сказаў Зюганаў. У сваю чаргу, Уладзімір Пуцін ужо неаднаразова адзначаў, што абвал расійскага фондавага рынку, адток капіталу з краіны і крызіс на міжбанкавым рынку выкліканы не ўнутрырасійскімі, а сусветнымі фактарамі.

### ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС ЗАКРАНУЎ І НОБЕЛЕЎСКІЯ ПРЭМІІ



**Фінансавае забеспячэнне Нобелеўскага фонду памяншаецца адначасова з падзеннем сусветных біржаў: значная частка капіталу фонду змешчана ў акцыі, на кошт якіх цяперашні фінансавы крызіс аказвае непасрэднае ўздзеянне, паведамляе ІТАР-ТАСС.**

Альфрэд Нобель быў вельмі багатым для свайго часу чалавекам. Першапачатковы памер фонду яго імя, заснаванага ў 1900 г., складаў 31 млн шведскіх крон (каля 250 млн сённяшніх амерыканскіх долараў), а прэміі выплачваліся за кошт працэнтаў ад здзелак з каштоўнымі паперамі. Памер капіталу фонду на пачатак 2008 года складаў 3,6 млрд крон (510 млн долараў). Прыкладна 68 працэнтаў капіталу Нобеля ўкладзена ў замежныя актывы, прычым, у асноўным — у ЗША. Гэта значыць 2,3 млрд крон (326 млн долараў) выпрабоўваюць на сабе ўздзеянне крызісу. Пакуль эксперты не могуць назваць пэўную лічбу, на колькі абясцэніліся каштоўныя паперы фонду, але, па папярэдніх разліках, гаворка можа ісці аб 30 працэнтах.

На прэміі сёлета будзе выдзелена 7,1 млн долараў. Дарэчы, для першых Нобелеўскіх лаўрэатаў іх памер складаў 7,7 млн крон (у пераліку на сучасныя горшы), а сёння ён вырас да 10 млн крон (1,42 млн долараў). Але калі цяперашні фінансавы крызіс стане яшчэ больш глыбокім, то, магчыма, грашовы складнік Нобелеўскай прэміі будзе істотна зменшаны.

### ВЕТЭРАН ВАЙНЫ Ў ІРАКУ СЦВЯРДЖАЕ, ШТО Ў 1991 ГОДЗЕ ЗША СКІНУЛІ НА ІРАК АТАМНУЮ БОМБУ

**Італьянская тэлекампанія RAI апублікавала інтэрв'ю з ветэранам вайны ў Іраку, які заявіў, што ЗША скінулі атамную бомбу ў раёне горада Басры падчас вайны ў Персідскім заліве ў 1991 годзе.**

Аб гэтым у чацвер пісала іспанскае выданне El Pais. Паводле слоў вайскоўца, Пентагон не пацвердзіў яму гэтую інфармацыю, паведаміўшы, што ў той час і ў тым месцы была скінута не атамная, а касетная бомба Blue 82. На днях італьянскія СМІ паказалі рэпартаж, заснаваны на доказах «за» і «супраць» атамнага бамбавання Ірака сіламі ЗША.

Былы амерыканскі вайсковец Джым Браўн, які браў удзел у аперацыі «Бура ў пустыні» падчас першай вайны ў Заліве, усё ж упэўнены: адміністрацыя ЗША аддала загад на скідванне атамнай бомбы магутнасцю 5 кілатон у раёне горада Басра на мяжы з Іранам 27 лютага 1991 года, у апошні дзень канфлікту.

Тэлекампанія RAI, якая паказала 20-хвілінны рэпартаж, растлумачыла, што вырашыла выпусціць яго ў эфір, таму што «няма пацвярджэнняў сапраўднасці гэтага абвінавачвання, але няма і аспрэчванняў», і неабходна, каб такое сур'ёзнае абвінавачванне было «вывучана міжнароднымі арганізацыямі з належнай празрыстасцю».

## Сонечна, але ўначы замаразкі

**Бліжэйшымі днямі на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць зона павышанага ціску, толькі ў паўночных раёнах адчуецца «подых» малаактыўных франтоў ад далёкіх цыклонаў, паведамілі рэдакцыі спецыялісты Рэспубліканскага гідраметэацэнтра.**

Таму ў суботу і нядзелю чакаецца сонечнае надвор'е, толькі па Віцебскай вобласці месцамі пройдзе невялікі дождж. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы 3—8, месцамі на глебе замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў, удзень ад 9 да 11 градусаў цяпла па паўночным усходзе, да 15—17 градусаў — па паўднёвым захадзе краіны. Захаваецца сонечнае надвор'е і ў панядзелак. Аднак у аўторак-сераду да нас павінны завітаць паветраныя масы з боку Заходняй Еўропы, што прывядзе да чаргавання зонаў паніжанага і павышанага атмасфернага ціску. Таму ў аўторак месцамі пройдзе невялікі дождж, а ў сераду будзе суха. Тэмпература паветра ўначы 4—10, удзень 8—14, па паўднёвым захадзе — да 17 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Супрацоўнікам міліцыі амаль у 3 разы павысяць выплаты за званне

**Савет Міністраў прыняў рашэнне аб тым, што з 1 лістапада практычна ў тры разы павысяцца матэрыяльныя выплаты за спецыяльнае званне супрацоўнікам міліцыі. Аб гэтым паведаміў начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Леанід Фармагей.**

У сярэднім сяржанту міліцыі толькі за званне будзе налічвацца каля Br150 тыс. штомесяц. Выплата будзе павялічвацца па нарастаючай. Палкоўнік міліцыі штомесяц будзе мець прыбаўку да зарплаты ў памеры звыш Br600 тыс.

Супрацоўнікам сталічнай міліцыі будзе кампенсавана аплата праезду на гарадскім грамадскім транспарце. «Пытанне аб бясплатным праездзе не страчвае сваёй актуальнасці, бо многія вымушаны ездзіць на грамадскім транспарце па службовых справах, асабліва гэта датычыцца ўчастковых і сышчыкаў, — сказаў начальнік сталічнай міліцыі. — Магу запэўніць, што будуць выдзелены грошы, якія пойдуць на кампенсацыю транспартных расходаў супрацоўнікаў». Ён падкрэсліў, што такога разумення з боку раённых і гарадскіх уладаў да патрэбаў міліцыі, як сёння, у Мінску не было вельмі даўно. Начальнік ГУУС нагадаў аб нядаўнім рашэнні Мінгарсавета аб увядзенні спецыяльнай надбаўкі ўчастковым інспектарам міліцыі і супрацоўнікам інспекцый па справах няпоўнагадовых.

**Кар. БЕЛТА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка**

| Наименование предмета аукциона | Здание гаража с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская обл., г. Пинск, ул. Козубовского, 23 |
| Продавец недвижимого имущества | РНДУП «Институт мелиорации», тел. (017) 288 51 95 |
| Характеристика предмета аукциона | Здание гаража 2-этажное, 1981 г.п., кирпичное, площадь – 724,8 кв. м, проходная, бетонное покрытие, забор металлический на бетонных столбах, металлические ворота. Земельный участок площадью 0,3755 га; срок аренды – 99 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 108 462 760 |
| Сумма задатка, руб. | 10 846 000 |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | р/с 3642202530011 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, 23 44 06, www.brest-region.by* |

Аукцион состоится **28 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона, внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок организации и проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

***Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 5 сентября 2008 г. № 167.***
***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 27 октября 2008 года включительно.***

## Объявление

**ВНИМАНИЕ!**

Аукцион по продаже земельного участка с кадастровым номером 240100000001006032 для строительства и обслуживания жилого дома, расположенного по адресу: г. Витебск, ул. Славянская, 35, объявленный коммунальным консалтинговым унитарным предприятием «Витебский областной центр маркетинга» на 16 октября 2008 года **отменяется.** Извещение о проведении аукциона было напечатано в газете «Звязда» от 10.09.2008 г.

***Информация о проведении аукциона по данному земельному участку будет сообщена дополнительно.***

УНП 390477566

**Богдановский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (продавец)**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 1 (одного) земельного участка для индивидуального жилищного строительства:

**Лот 1** — земельный участок в пос. Богданов, переулок Октябрьский, площадь участка 0,25 га, начальная цена 1600000 белорусских рублей. Имеется линия электропередач, подъезд, возможен подвод водоснабжения.

**Целевое назначение** земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Земельный участок расположен в пос. Богданов. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

**Задаток** в размере 10 % от начальной цены перечисляется в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3604000000394 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, гор. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037302, назначение платежа 04901.

**Аукцион состоится 20 ноября 2008 года в 11.00 по адресу: пос. Богданов, ул. Советская, 1, здание сельисполкома.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14 ноября 2008 года до 17.00 по адресу: пос. Богданов, ул. Советская, 1, кабинет секретаря.**

**Контактный телефон 8 01772 45 436.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

| Наименование объекта | Изолированное помещение (аптека с забором) | Изолированное помещение (аптечный пункт первой категории) | Изолированное помещение (аптека № 131) |
|---|---|---|---|
| Местонахождение объекта | Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Залужье, ул. Центральная, 1а | Брестская обл., Каменецкий р-н, д. Ратайчицы, ул. С. Вирко, 84 | Брестская обл., Ганцевичский р-н, д. Денисковичи, ул. Мира, 1 |
| Продавец объекта | Брестское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация» | | |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество» | | |
| Начальная цена продажи, руб. | 5 410 503 | 26 682 494 | 57 485 622 |
| Сумма задатка, руб. | 541 000 | 2 668 000 | 5 748 000 |
| Характеристика объекта/площадь земельного участка, га, реш. об отводе зем. участка | Здание 1954 г.п., стены кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная, забор дощатый, площадь здания – 55,5 кв.м/0,4246 га, в общей долевой аренде сроком на 49 лет, решение Дрогичинского РИК от 28.04.2006 г. № 309 | Здание 1958 г.п., стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная, забор дощатый, площадь здания – 56,3 кв.м/0,0337 га, реш. Каменецкого районного Совета депутатов от 30.12.1993 г. | Здание 1976 г.п., фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, крыша рулонная, совмещенная, площадь – 168,1 кв.м/0,030 га, в общем долевом пользовании, реш. Ганцевичского РИК от 03.10.2006 № 718 |

Аукцион состоится **11 ноября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность.

5. Юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

6. Юридическими и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на русский язык.

7. Представителями юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Участник аукциона, прошедший заключительную регистрацию, возмещает организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, согласно счету-фактуре в течение 3-рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения аукционных торгов определяются Положением о проведении аукционов по продаже объектов республиканской собственности и права на заключение договора аренды нежилого помещения, утвержденным постановлением Министерства по управлению государственным имуществом и приватизации Республики Беларусь от 27.10.2000 № 19.

***Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 10 ноября 2008 года включительно.***
***Контактные телефоны: 8 0162 20 87 85, 23 12 63, 23 44 06, www.brest-region.by***

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

10 КАСТРЫЧНІКА 2008 г. ПЯТНІЦА № 40 (15544)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Нітка да ніткі...

# З ДЗЁННІКА ЗВЫЧАЙНАГА СТУДЭНТА

## Лекцыйнае жыццё: Гіпакрат і Зініны шкарпэткі

— Іваноў?
— Я.
— Сідарава?
— Ёсць.
— Куніцына?
— Тут я.
— Махнатка?
— Махнатко!!!На апошні склад націск!!!

...Сярод студэнцкага гулу кожны стараецца не праваронiць сваё прозвішча. Дэканат прыйшоў. Але хвіліны праз дзве ён сыдзе і жыццё на лекцыі зноў пойдзе сваім парадкам. Выдатніцы з сумленнасцю возьмуцца за ручкі, сяброўкі-шчабятушкі прымуцца абмяркоўваць хлопцаў з учарашняй дыскатэкі; у сектары гламурных прыгажунь пачуюцца ажыўленыя ўздыхі па новых скрабах з глянцавых каталогаў, спячыя шэрагі ўладкуюцца паўтульней... Большасць жа студэнтаў, жуючы які-небудзь піражок, дастануць аднекуль свежую газету і з перапынкамі на канспектаванне лекцыі прымуцца за чытанне. А мая аднагрупніца Зіна давяжа нарэшце мяккія шкарпэткі ў падарунак для сяброўкі...

Лекцыя сярэднестатыстычнага студэнта пачынаецца па-рознаму. Як і ва ўсе студэнцкія часы, тут усё залежыць ад выкладчыка і ад прадмета. Як прэзентуе сябе выкладчык на першым занятку, так ён сябе і зарэкамендуе. Па вялікім рахунку, ад гэтага і адштурхоўваюцца пазней студэнты.

Выкладчык. Строгі ці лаяльны. Мужчына ці жанчына. Малады ці пажылы. З пачуццём гумару ці з яго лішкам. Той, да каго можна спазніцца на паўгадзіны ці той, хто не даруе і пяці хвілін адсутнасці.

Прадмет. Для прыкладу, возьмем лекцыю па прадмеце, які многія студэнты лічаць «не вельмі патрэбным». Тут (у радах «не вельмі патрэбных» для навучання дысцыплін) можа быць што заўгодна — ад асноў вышэйшай матэматыкі ў філолагаў, да бібліятэказнаўства на факультэце радыёфізікі. У вучэбных планах студэнтам прадмет паставілі, але ў саміх студэнтаў, як гэта заўсёды бывае, спытаць забыліся.

Безумоўна, ёсць у сярэднестатыстычнага студэнта і любімыя лекцыі. Але ёсць і тыя, якія ён адносіць да катэгорыі патрэбных, але не вельмі актуальных. Ды і ўзяць бы прыродазнаўства...

Не ведаю, хто першы заўважыў, што студэнты ўсіх ВНУ павінны праслухаць гэты курс, але чалавеку трэба паставіць помнік. А побач і яшчэ адзін — студэнту.

Калі ты вучышся ў другую змену, якая пачынаецца а 13-й, і твой вучэбны дзень складаецца з чатырох лекцый з перапынкамі па пяць хвілін, то хочаш не хочаш, а да вечара засяваеш на ўсю Іванаўскую. Ад голаду, холаду, недасыпу, няшчаснага кахання — словам, ад усяго, што так надзённа для студэнта. А калі яшчэ прыродазнаўства апошняй парай...

***

...Першыя, хто спазніўся, заходзяць у аўдыторыю ўжо на пятай хвіліне лекцыі. «Усё ляцяць і ляцяць тыя коні...»

Усё ідуць і ідуць студэнты, толькі збруя ў іх не са срэбра, а з цэлафану. Калі чуеш шорганне цэлафанавых пакетаў, ведаеш: аднакурснікі ўжо затарыліся булачкамі, сасіскамі... і васямнаццацю відэльцамі.

«Сё-оння мы-ы з ва-а-амі пагаво-орым пра прыро-ода-знаўства...» — манатонным голасам пачынае выкладчык. І адразу, як пад гіпнозам, твая галава апускаецца на мяккае плячо суседкі...

«Усё зразумела. Ён — зануда», — чую ад яе, якая, дастаўшы чарговую сардэльку ў цесце, спрабуе, перакусваючы, паралельна чытаць газету. — «Бліжэйшую гадзіну можна адпачыць».

— А хто ў нас семінары праводзіць будзе?! — звонкім і яшчэ бадзёрым голасам нахабна перабівае выкладчыка фарбаваная бландзінка з галёркі.

— Ну-у, у каго-осці я. У каго-осці — іншыя выкла-а-адчыкі-і, — ледзь не пазяхаючы, спрабуе патлумачыць выкладчык дзяўчыне.

Але тая яго нават не даслухала. Вядома, у яе сваіх спраў поўны воз — дафарбаваць пазногці новым лакам са стракатымі блішчынкамі, прагартаць новую партыю глянцавых каталогаў і дэталёва абмеркаваць новую спадніцу Вікі Тапкінай з суседняй паралелі.

**ЧАС: ДА КАНЦА ЛЕКЦЫІ ГАДЗІНА І ПЯТНАЦЦАЦЬ ХВІЛІН**

І што гэта з гадзіннікавай стрэлкай сталася? Паўзе як слімак. А яшчэ кажуць, час хутка бяжыць! Ужо дзе-дзе, але не на лекцыі.

Вось і першыя ўцекачы. Дзяўчаткі. Узгадалі, відаць, пра пакінутае на пліце малако. Вядома, хутчэй дадому! Добра ім: паедуць у цёплую ўтульную хату, паядуць гарачага матулінага супу... Тут узгадваецца халодны пакой інтэрната і халадзільнік, які больш прыдатны да гульні у боўлінг (закаці гарошак). Не, я лепш тут пасяджу. Тут цёпла.

Словы выкладчыка далятаюць усё радзей і марудней. Сонныя флюіды паступова ахутваюць ўсё часцей. Каб не заснуць, спрабуеш зразумець і асэнсаваць сказанае выкладчыкам толькі што. Але позні час чацвёртай пары дае аб сабе знаць: вейкі, бы дзверы тралейбуса, цяжка закрываюцца, а галава, абцяжараная думкамі і стомленасцю, як свінцовая, усё з большай сілаю хіліцца на парту... «Прыродазнаўства — гэта вельмі важная навука... Яшчэ Гіпакрат казаў...».

**ЧАС: ПРАЗ 30 ХВІЛІН**

«...Вось гэта і казаў Гіпакрат! Запомніце, студэнты».

Пятнаццаць хвілін хуткага сну аказваецца і сапраўды лепш за гадзінныя валянні ў канапе. Але выкладчык зараз даводзіць зусім не пра гэта:

«Прыродазнаўства — гэта ве-ельмі важная навука. Увогуле, гэта сукупнасць найбольш абумоўленых фактараў рэчаіснасці, якія адпавядаюць цэласнаму светаўяўленню і светаўспрыманню пэўных катэгорый — носьбітаў культуры, якія па псіхалагічным і псіхафізічным дзяленні маюць разнародную будову і абумоўлены асобнай дыферэнцыяцыяй...».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Наш фармат

# «ГЭТА НАША З ТАБОЙ БІЯГРАФІЯ...»



**Гэты год асаблівы для Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі: 29 кастрычніка на 40-м з'ездзе БРСМ будуць падведзены вынікі работы маладзёжнай арганізацыі за апошнія 3 гады і акрэслены планы на перспектыву. Таксама на гэты дзень прыпадае яшчэ адна знамянальная для маладзёжнага саюза падзея — 90-годдзе камсамола.**

Як адзначыў нам **сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ДАЛЖЭЎСКІ,** камсамол прайшоў нялёгкі шлях, адыграў значную ролю ў гісторы ўсіх саюзных рэспублік. Пераадольваючы вялікія цяжкасці, неўладкаванасць побыту, мільёны юнакоў і дзяўчат ударна працавалі, паспяхова вучыліся, цікава жылі. Камсамол назапасіў вялікі вопыт работы з моладдзю: ударныя будоўлі, камсамольска-маладзёжныя брыгады, конкурсы прафесійнага майстэрства, школы маладых вучоных і спецыялістаў, студэнцкія будаўнічыя атрады, паходы па месцах баявой і працоўнай славы, фестывалі маладых талентаў, дзіцячыя спартыўныя клубы. Па ініцыятыве камсамола былі прыняты законы і пастановы ўрада па найважнейшых пытаннях жыцця, працы, вучобы і адпачынку моладзі. Камсамол не кануў у Лету. Засталіся яго справы, яго дух. Эстафету ад свайго папярэдніка прыняў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Маладзёжны саюз стаў годным пераемнікам традыцый камсамола. Удалося аднавіць традыцыі студэнцкіх атрадаў, працоўных спаборніцтваў моладзі. Канструктыўная і мэтанакіраваная дзейнасць арганізацыі дапамагла вярнуць у маладзёжнае асяроддзе пачуццё калектывізму і высокай грамадзянскай адказнасці, што дазваляе аб'яднаць намаганні ўсіх пакаленняў у імя адзінай і высакароднай мэты: стварэнне моцнай і квітнеючай Беларусі, адзначае Аляксандр Далжэўскі. Паводле яго слоў, на працягу кастрычніка ва ўсіх рэгіёнах Беларусі пройдуць шматлікія мерапрыемствы ў рамках праекта «Камсамолу-90! Новы фармат!». Прычым тэрытарыяльныя камітэты БРСМ самастойна вызначаюць формы сваёй дзейнасці. Да прыкладу, падчас праекта «Іх імёнамі названы ...» актывісты саюза размяшчаюць у газетах, на радыё, у інтэрнэт-прасторы інфармацыю пра гісторыю назваў вуліц, памятных месцаў сваіх гарадоў, раёнаў, звязаных з камсамолам. А падчас праекта «Знаёмы голас» у грамадскім транспарце галасамі вядомых людзей (зоркі беларускай эстрады, тэле- і радыёвядучыя) будуць аб'яўляць прыпынкі, віншаваць са святам, анансаваць мерапрыемствы, прысвечаныя 90-годдзю камсамола. Нельга не прыгадаць серыю флэшмобаў «Як загартоўвалася сталь...». У перадюбілейныя дні кастрычніка, у гістарычных месцах гарадоў, раёнаў, звязаных з камсамольскім рухам, актыў арганізацыі ўстановіць стэнды з камсамольскімі фотаздымкамі, муляжы ордэнаў (атрыманых камсамолам), фотапано, каля якіх размесцяцца групы актывістаў у стылізаваных касцюмах. Актывісты будуць віншаваць прахожых, прапаноўваць зрабіць памятныя фотаздымкі, раздаваць буклеты. Падчас флэш-моба «Святкуем разам...» актывісты арганізацыі з атрыбутыкай БРСМ размяшчаюцца ў шматлюдных месцах, на вуліцах, у памятных месцах раёнаў, горада, звязаных з камсамолам, віншуюць прахожых са святам, прапаноўваюць ахвотнікам зрабіць стылізаваную «татуіроўку», паставіць штамп, на якія нанесены розныя малюнкі з тэкстам аб святкаванні 90-годдзя камсамола, напрыклад: «Камсамолу-90»; «Святкуем РАЗАМ»; «90» і гэтак далей. У святочныя дні тэрытарыяльныя камітэты БРСМ арганізоўваюць таксама збор інфармацыі па тэмах: «Каханне, камсамол і вясна» (расказ пра сямейныя пары, якіх пазнаёміў камсамол), «Юнацкасць камсамольская мая».

Лепшыя з сабраных расказаў будуць размешчаны на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі». Будуць арганізаваны сустрэчы актыву арганізацыі з камсамольцамі розных гадоў. Як падкрэсліў Аляксандр Далжэўскі, 2008-ы — Год здароўя. І таму маладыя людзі не маглі абмінуць і гэту тэматыку. У прыватнасці, пад знакам 90-годдзя камсамола ў краіне пройдуць шматлікія спартыўныя мерапрыемствы.

А сёння маладзёжныя флэш-акцыі ў рамках праекта «Камсамолу-90! Новы фармат!» пройдуць у Віцебску. З 16 гадзін віншаваць моладзь са святам будуць вядомыя беларускія калектывы і выканаўцы, лепшыя дыджэі краіны, самыя таленавітыя, актыўныя, крэатыўныя і прагрэсіўныя прадстаўнікі маладзёжных субкультур. Віцябчанам будзе прапанавана стаць самымі актыўнымі ўдзельнікамі маладзёжных праектаў. Да прыкладу, на пляцоўцы «Сіла мая камсамол» самыя моцныя і спартыўныя гараджане, якія паспрабавалі свае фізічныя магчымасці, атрымаюць стылізаваны значок з надпісам ГПА. А стаць уладальнікам значка з надпісам «Варашылаўскі стралок» зможа кожны, хто вырашыць пазмагацца са шкоднай звычкай, напісаўшы пра яе на паветраным шары і трапіўшы ў яго дроцікам. Адправіцца «У будучыню разам з намі!» можна, запусціўшы праз сімвалічнае кальцо часу ў паштовую скрыню вырабленыя з паперы самалёцікі з напісанымі на іх пасланнямі для моладзі будучыні. Дарэчы, падчас маладзёжных акцый прадугледжаны і смачныя падарункі. Да прыкладу, суперпрыз-гарбуз атрымае лепшы знаўца камсамольскіх і маладзёжных песень. А завершыць серыю віцебскіх флэш-акцый праект «Палёт мары», падчас якога юнакі і дзяўчаты запусцяць у неба шары з напісанымі на іх марамі .

Сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Далжэўскі запрашае ўсіх прыняць самы актыўны ўдзел у акцыях маладзёжнага саюза і перакананы, што маладыя людзі і ўвогуле тыя, хто мае дачыненне да камсамола, знойдуць сабе мерапрыемства па душы.

**Святлана СУХАРКО.**

# У БУДУЧЫНЮ — СМЕЛА!

**На Беларускім металургічным заводзе разам з Саветам маладых спецыялістаў працуе і Школа маладога вучонага, якая падрыхтоўвае маладых спецыялістаў для паступлення ў магістратуру і аспірантуру. Зусім нядаўна 2 чалавекі тут атрымалі званне кандыдатаў тэхнічных навук, 14 рыхтуюцца да абароны і 16 атрымалі накіраванне ў магістратуру.**

Маладыя супрацоўнікі мерапрыемства, як паведаміў **старшыня Савета маладых спецыялістаў БМЗ Дзяніс ЛІПЧЭЎСКІ,** актыўна працуюць над распрацоўкай і ўкараненнем інавацыйных праектаў. Па яго словах, Савет маладых спецыялістаў праводзіць шэраг мерапрыемстваў, якія спрыяюць павелічэнню творчай актыўнасці моладзі і заахвочваюць яе да вынаходніцкай дзейнасці. З гэтай мэтай штогод на заводзе праводзяцца навукова-тэхнічныя канферэнцыі маладых працаўнікоў. Свае напрацоўкі і распрацоўкі ў галіне тэхналогій і канструкцыі абсталявання тут прадстаўляюць маладыя супрацоўнікі прадпрыемства.

— Гэта цудоўны спосаб праявіць сябе, паказаць свае веды і ўменні, прадставіць заводу новыя ідэі. Акрамя канферэнцый на нашым заводзе, мы бяром удзел і ў міжнародных навукова-тэхнічных канферэнцыях на металургічных і машынабудаўнічых прадпрыемствах СНД. Дзякуючы нашаму кіраўніцтву на Беларускім металургічным заводзе створаны ўсе ўмовы для актыўнага ўдзелу моладзі ў навуковай, рацыяналізатарскай і інавацыйнай дзейнасці прадпрыемства.

А імкнуцца ёсць да чаго: сталявары БМЗ зарабляюць у месяц паўтары—дзве тысячы долараў у эквіваленце. «І гэта не мяжа, — адзначае намеснік генеральнага дырэктара БМЗ Надзея Гаркуша, — на прадпрыемстве імкнуцца пастаянна павялічваць заработную плату. Дастойную зарплату атрымліваюць таксама маладыя спецыялісты».

Акрамя таго прадпрыемства пастаянна будуе жыллё для сваіх работнікаў. Толькі за апошнія два гады на гэтыя мэты накіравана 5 млрд рублёў. Пры гэтым металургі, у тым ліку і маладыя, маюць магчымасць пабудаваць сабе кватэры на льготных умовах.

**Ільля ЛАПАТО.**

# НА ЗАСТАВЕ

ПлацдАРМ

Фота Уладзіміра ЧАБЕРКУСА, БЕЛТА.



**Пагранічная застава «Брэст» імя Героя Савецкага Саюза Андрэя Кіжаватава.**

Першыя вяршыні

# «СКУРАНЫ МЯЧ» ЧАКАЕ НОВЫХ СУСТРЭЧ

**У Маладзечне адбыліся фінальныя гульні на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба «Скураны мяч». У іх удзельнічала 8 камандаў, якія прадстаўлялі вобласці Беларусі, а таксама горад Мінск.**

— Фінальны этап гульняў — гэта выдатная магчымасць паказаць хлопцам сваё майстэрства, а трэнерам — прыгледзець прэтэндэнтаў у юнацкую зборную краіны, а потым і ў нацыянальную каманду. Бо многія нашы знакамітыя спартсмены пачыналі са «Скуранога мяча», — сказаў на адкрыцці турніру Аляксандр Храмылёў, памочнік Старшыні Прэзідэнцкага спартыўнага клуба па спорце.

А потым лепшыя стадыёны нашага раёна на працягу чатырох дзён былі аддадзены юным футбалістам. Каманды правялі па 4 гульні, а самае цікавае балельшчыкі спадзяваліся ўбачыць у фінале.

А фінал адкрыў... праліўны дождж. І ў барацьбе за 3-е і 1-е месцы каманды гулялі на адкрытым гарадскім стадыёне на мокрым полі. З-за надвор'я матчы не адмянілі, і спартсмены паказалі не толькі сваё імкненне да перамогі, але і сапраўды прыгожую гульню. Гонар і хвала балельшчыкам, якія, нягледзячы на дождж, прыйшлі падтрымаць фіналістаў. А што датычыцца гульні, то абедзве сустрэчы завяршыліся з лікам 1:0 і галы былі забіты на апошніх хвілінах матча.

— Бясспрэчна, хлопцы з Ліды — дастойныя сапернікі і нават балельшчыкі перад матчам ішлі ў заклад на іх карысць, — гаворыць Сяргей Носік, капітан каманды «Юнацтва» Лепельскага раёна. — Але мы вельмі хацелі выйграць і ў нас гэта атрымалася.

Кубак чэмпіёнаў і залатыя медалі павезлі хлопцы ў Віцебскую вобласць, «серабро» заваявалі мінчане, а «бронзу» — каманда «Фрунзенец» г. Мінска.

Памятнымі сувенірамі былі адзначаны і лепшыя гульцы спаборніцтваў. Гэта Дзмітрый Калоша (лепшы галкіпер), Аляксандр Курбака (лепшы абаронца), Дзмітрый Свірыдаў (лепшы паўабаронца), Ігар Занько (лепшы нападаючы) і Дзяніс Богуць (лепшы бамбардзір).

— Вы падарылі нам шмат цікавых імгненняў, паказалі сваё ўменне і мэтанакіраванасць — і гэтым заваявалі сэрцы балельшчыкаў, — падвёў вынікі 13-га фінальнага турніру Анатоль Усенка, заслужаны трэнер Беларусі. — Дзякуй вам за гульню.

Сцяг спаборніцтваў апускалі капітаны ўсіх 8 камандаў. Але з закрыццём турніру не заканчваюцца футбольныя баталіі. А значыць — да новых сустрэч на стадыёне.

**Святлана МАРКЕЛАВА, вучаніца 9 «Е» класа гімназіі № 10 г. Маладзечна.**

# ПРЫМАЛЬНЫ ВАРЫЯНТ ДЛЯ БАЦЬКОЎСКАГА КАШАЛЬКА

## ці Як сучаснаму адзінаццацікласніку падрыхтавацца да паступлення?

**Колькасць ахвотнікаў насіць ганаровае званне студэнта з году ў год расце як грыбы ўвосень. Кожны настроены змагаецца за месца пад сонцам да апошняга. Але для таго, каб напрыканцы навучальнага года камусьці скласці канкурэнцыю, трэба ўжо сёння пачынаць працаваць над сабой...**

### ПЕРШЫ ШЛЯХ — РЭПЕТЫТАР

Цяпер амаль кожны школьнік, які задаўся мэтай паступіць у ВНУ, мае ўласнага настаўніка, а то і не аднаго. Рэпетытары прапаноўваюць свае паслугі паўсюль: аб'явы можна ўбачыць у інтэрнэце, на старонках газет, на слупах, на аўтобусных прыпынках, на дзвярах пад'ездаў. Але сярод іх, на жаль, маюцца «прафесіяналы» з сумнеўнай кваліфікацыяй. Таму каб не выкінуць грошы на вецер і не страціць час упустую, да выбару рэпетытара трэба падыходзіць адказна.

**Дзе шукаць?**

Існуе меркаванне, што добры рэпетытар аб'яў не дае, а перадаецца «з рук у рукі». Таму самы надзейны варыянт пашукаць рэпетытара праз знаёмых, дзеці якіх вучацца ў ВНУ. Кваліфікаваныя педагогі вядомыя ў студэнцкім асяроддзі, таму такі метад пошуку можа аказацца больш дзейсным, чым стасункі з выпадковымі людзьмі.

**Адукацыя**

Рэпетытар павінен мець педагагічную адукацыю.

**Вопыт работы**

Павінен мець вопыт работы, калі не ў рэпетытарстве, то ў школе.

**Навуковае званне**

Навуковае званне, сертыфікаты і рэгаліі не павінны з'яўляцца вызначальнымі крытэрыямі падчас выбару рэпетытара, бо ведаць прадмет і ўмець навучаць — зусім розныя рэчы. Ні адзін педагог, які сябе паважае, не дае гарантый залічэння ў ВНУ. Добры рэпетытар можа толькі абяцаць падрыхтаваць школьніка на вызначаную адзнаку. Калі чалавек запэўнівае вас у тым, што выпускнік стане студэнтам, хутчэй за ўсё, ён махляр.

### КОШТ ПАСЛУГ

Кошт паслуг залежыць ад кваліфікацыі рэпетытара і прадмета, які ён выкладае. Нясцярожана стаўцеся да вельмі нізкага кошту — рэпетытары з «заніжанай самаацэнкай», хутчэй за ўсё, спадзяюцца, што з-за эканоміі вы заплюшчыце вочы на іх нізкую кваліфікацыю. Але і завоблачны кошт таксама выклікае падазрэнні — ёсць верагоднасць, што рэпетытары проста выцягваюць грошы, хаваючыся за багатым вопытам работы. Акрамя таго, трэба мець на ўвазе і тое, што індывідуальныя прадпрымальнікі, якія плацяць падаткі за рэпетытарскую дзейнасць, прэтэндуюць на большыя сумы, чым рэпетытары-нелегалы. І не дзіўна, бо адзіны падатак для сталічнага рэпетытара складае 45 еўра ў месяц. З павелічэннем выдаткаў рэпетытара — падымаецца і плата за яго паслугі.

**Узаемаадносіны**

Бацькі вучня плацяць за веды па выбранай дысцыпліне і за час навучання, таму рэпетытар, які расказвае вашай дачцэ ці сыну пра свае праблемы і адказвае на тэлефонныя званкі, наўрад ці самы лепшы выбар. Трэба таксама пазбягаць выкладчыкаў, якія выдаюць вучню для выканання падчас занятку самастойныя заданні. Іх можна зрабіць і дома, а аплачаны час мэтазгодней прысвяціць непасрэдным стасункам з педагогам.

### ДРУГІ ШЛЯХ — ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ ПРЫ ВНУ

Плюсы такіх курсаў заключаюцца, па-першае, у тым, што лекцыі чытаюць кваліфікаваныя выкладчыкі, якія мэтанакіравана рыхтуюць да паступлення ў канкрэтную навучальную ўстанову, па-другое, гэта абыдзецца значна танней, чым плаціць індывідуальнаму педагогу.

**Для таго каб скласці агульны партрэт рэпетытара, мне давялося зрабіць мноства тэлефонных званкоў па аб'явах, знойдзеных у інтэрнэце. Вось што атрымалася:**

**1) Рэпетытарствам займаюцца студэнты, выкладчыкі ВНУ, школьныя настаўнікі і ў выпадку з замежнымі мовамі, носьбіты мовы;**

**2) У асноўным рэпетытарствам займаюцца прадстаўніцы жаночага полу;**

**3) 45 хвілін занятку каштуе ад 5 да 20 долараў;**

**4) Дарослыя рэпетытары прымаюць кліента ва ўласнай кватэры, студэнты ж прапануюць іншае месца, напрыклад, Нацыянальную бібліятэку ці вольную аўдыторыю ВНУ.**

Можна пайсці на вячэрнія курсы,




якія доўжацца 9 месяцаў. А можна абмежавацца больш кароткім тэрмінам навучання. Для тых, хто жыве не ў сталіцы, але хоча рыхтавацца пад наглядам мінскіх выкладчыкаў, маюцца нават платныя завочныя курсы.

Ну а што рабіць тым, хто вучыцца не ў ліцэі ці гімназіі, а ў самай звычайнай школе і чым бацькам да таго ж рэпетытараў браць не пад сілу?

### ТРЭЦІ ШЛЯХ — САМ САБЕ НАСТАЎНІК

Можна, вядома ж, рыхтавацца самастойна. Так рабілі нашы маці і таты, якія яшчэ 20—30 гадоў таму нават уяўлення не мелі пра рэпетытараў, не тое што грошай на такія паслугі. Але падрыхтавацца самастойна да тэстаў па ўсіх прадметах цяпер вельмі складана. Для гэтага, як мінімум, патрэбна запасціся дадатковай літаратурай. Нядрэнна азнаёміцца са зборнікамі тэстаў, якія падрыхтаваны беларускім Інстытутам кантролю ведаў. Яны маюцца па ўсіх прадметах. Зборнікі складзены па матэрыялах цэнтралізаванага тэсціравання папярэдняга года і ўключаюць аналіз характэрных памылак, статыстычныя даныя, каментарыі да адказаў і трэніровачныя тэсты. Акрамя таго, каб рыхтавацца самастойна, будучаму абітурыенту трэба валодаць сапраўды моцнай сілаю волі.

### ЧАЦВЁРТЫ ШЛЯХ — ШКОЛЬНЫЯ ФАКУЛЬТАТЫВЫ

У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што факультатыўныя заняткі стануць сур'ёзнай альтэрнатывай нелегальнаму рэпетытарству. Тым больш што для школьнікаў, гімназістаў і ліцэістаў яны бясплатныя. Паводле слоў саміх настаўнікаў, у факультатываў маецца адзін тлусты мінус, звязаны з псіхалогіяй вучняў старэйшых класаў: да заняткаў з рэпетытарам яны ставяцца больш адказна, чым да дадатковых школьных урокаў.

— У нас у школе навучаецца 206 чалавек, наведваюць факультатыўныя заняткі 296 школьнікаў. Звязана гэта з тым, што некаторыя дзеці праявілі жаданне наведваць больш чым адзін дадатковы факультатыўны занятак, — адзначыла **завуч па вучэбнай рабоце Олтушскай сярэдняй школы Маларыцкага раёна Алена МАРУК.** — Самыя папулярныя прадметы сярод нашых навучэнцаў — матэматыка, гісторыя і мовы, у тым ліку нямецкая. Раней наша школа насіла статус агульнаадукацыйнай установы з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы. Цяпер у сувязі з рэформай Міністэрства адукацыі замежная мова вывучаецца паглыблена толькі за кошт факультатываў. Мінімальная напаўняльнасць групы для правядзення факультатыўных заняткаў у нашай школе, як і ва ўсіх сельскіх школах складае 3 вучні (у гарадскіх школах — 5 вучняў). А прадугледжаны для факультатываў час дырэктар размяркоўвае ў адпаведнасці з пададзенымі заявамі бацькоў школьнікаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# НАЙВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ У БУДАЎНІЧАЙ ПРАФЕСІІ

**Рэсурсны цэнтр па падрыхтоўцы спецыялістаў для будаўнічай галіны адкрыўся на базе мінскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 52 будаўнікоў.**

Як расказала нам начальнік аддзела прафесійна-тэхнічнай адукацыі Мінгарвыканкама Алена Чарных, гэта сумесны праект навучальнай установы і вядомай будаўнічай кампаніі «Хенкель Баўтэхнік». Прадукцыя гандлёвай маркі «Ceresit» добра вядомая на беларускім рынку: гэта фуга, грунтоўка, розныя віды клеяў і многае-многае іншае. Немалаважна, што з нядаўняга часу прадукцыя кампаніі «Хенкель» выпускаецца пад Мінскам, у Заслаўі, дзе быў адкрыты завод «Хенкель Баўтэхнік». Яго прадукцыя ўключана ў рэспубліканскую праграму імпартазамяшчэння.

Рэсурсны цэнтр — гэта вучэбная майстэрня, абсталяваная на самым сучасным узроўні, якая складаецца з двух класаў — тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі. Тут прадстаўлены ўзоры выкання тых ці іншых будаўнічых работ з выкарыстаннем прадукцыі «Ceresit» (абліцоўка, гідраізаляцыя, уцяпленне фасадаў, уладкоўванне падлогі), розныя інструменты, тэхналагічныя карты, каталогі, кампакт-дыскі, якія могуць аказацца вельмі карыснымі ў засваенні прафесіі будаўніка. Мэта стварэння цэнтра — падрыхтоўка спецыялістаў для будаўнічай галіны самай высокай кваліфікацыі, у першую чаргу майстроў вытворчага навучання, каб яны затым маглі рыхтаваць канкурэнтаздольных рабочых і спецыялістаў для будаўнічай галіны, гатовых працаваць у новых умовах.

Яшчэ адзін перспектыўны накірунак работы рэсурснага цэнтра — перападрыхтоўка людзей па накіраваннях службы занятасці, а таксама павышэнне кваліфікацыі інжынераў і прарабаў. Варта нагадаць, што летась на базе Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі быў адкрыты рэсурсны цэнтр па падрыхтоўцы кадраў для машынабудаўнічай галіны. Гэта таксама быў сумесны праект РІПА з нямецкімі партнёрамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



У Віцебску на плошчы Свабоды прайшоў кірмаш прадукцыі навучальных установаў Прыдзвінскага краю. У шырокім асартыменце на кірмашы была прадстаўлена сельгаспрадукцыя, швейныя і мастацкія вырабы, піламатэрыялы, металавырабы і іншае.

**На здымку: Жанна КАВАЛЁВА** з Обальскай СШ Шумілінскага раёна прапаноўвала гараджанам сімпатычных трусоў, вырашчаных рукамі школьнікаў.

**Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.**

# ПРЫМАЛЬНЫ ВАРЫЯНТ ДЛЯ БАЦЬКОЎСКАГА КАШАЛЬКА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Агульнаадукацыйныя ўстановы могуць аказваць школьнікам дадатковыя платныя паслугі звыш вучэбных гадзін, устаноўленых вучэбным планам (згодна з пастановай Савета Міністраў ад 3 кастрычніка 2002 года «Аб зацвярджэнні пераліку платных паслуг, якія аказваюцца дзяржаўнымі ўстановамі адукацыі»). Гэта могуць быць камп'ютарныя курсы, рэпетытарства, курсы па вывучэнні другой замежнай мовы... Адна акадэмічная гадзіна групавых заняткаў каштуе 3880 рублёў, занятак педагога з адным дзіцем — 12 200.

— Платныя паслугі аказваюцца толькі на падставе заключанага дагавора паміж бацькамі і адміністрацыяй навучальнай установы. У нашай школе такой практыкі яшчэ не было, — працягвае **Алена МАРУК**. — Пакуль што няма попыту. Сёння тыя вучні, якім недастаткова факультатыўных заняткаў, маюць магчымасць перайсці вучыцца ў ліцэй. Але, як паказвае практыка, ліцэісты таксама прыходзяць да нас, каб мэтанакіравана займацца нямецкай мовай.

**ПЯТЫ ШЛЯХ — ЦЭНТР ДАДАТКОВАГА НАВУЧАННЯ**

А вось школьнікам Міёрскага раёна 5 гадоў таму зрабілі падарунак, заснавалі на базе гарадской школы Цэнтр даўніверсітэцкай падрыхтоўкі (цяпер Цэнтр дадатковага навучання).

— Цэнтр узнік дзякуючы падтрымцы раённай улады, у першую чаргу таму, што наш раён знаходзіцца на значнай адлегласці як ад сталіцы і абласнога цэнтра, так і ад Полацка, і Наваполацка, — расказвае **дырэктар Цэнтра дадатковага навучання Міхаіл РОЛІК**. — Бацькі, нават калі б і хацелі наняць для свайго сына, напрыклад, рэпетытара са сталічнай ВНУ, то не маюць магчымасці. Альтэрнатывай рэпетытарскіх паслуг, а таксама і падрыхтоўчых курсаў для абітурыентаў і стаў новы цэнтр. Сёння тут працуе 8 груп напаўняльнасцю не больш чым 12 чалавек.

Задача работнікаў Цэнтра — падрыхтаваць, у тым ліку і псіхалагічна, маладых людзей да цэнтралізаванага тэсціравання. Акрамя тэарэтычных і практычных навыкаў тут праводзяць рэпетыцыйныя тэсціраванні, вучаць школьнікаў запаўняць бланкі. Заняткі праходзяць два разы на тыдзень па 3 гадзіны. Адна акадэмічная гадзіна каштуе крыху менш, чым 2 долары.

— Большая частка нашых навучэнцаў — міярчане, але вучні з сельскіх школ таксама праяўляюць жаданне займацца. Летась, напрыклад, толькі з Чапукоўскай школы была сфарміравана цэлая група. Цэнтр за гэты час ужо зарэкамендаваў сябе, таму сёлета нават для ўсіх ахвотных не хапіла месцаў, таму ў бліжэйшы час плануем адкрыць яшчэ адну групу. Акрамя таго, наш цэнтр не толькі дапамагае школьнікам падцягнуць і сістэматызаваць школьныя веды і даць пуцёўку ў ВНУ, але і часткова вырашае праблему з «чорным» рэпетытарствам. Кваліфікаваным педагогам раёна, якія працуюць не толькі ў Цэнтры, але і вядуць урокі на пастаянных месцах працы, не застаецца часу на дадатковыя заробкі.

Як бачыце, ёсць некалькі шляхоў падрыхтавацца да цэнтралізаванага тэсціравання і паступлення ў ВНУ. Але ў любым выпадку канчатковае рашэнне застаецца за бацькамі, якія самі выбіраюць найбольш прымальны варыянт, як для дзіцяці, так і для свайго кашалька.

**Надзея ДРЫЛА.**

### ДАПАМОГА Ў КРЫЗІСНАЙ СІТУАЦЫІ

Кожнае дзіця, іх бацькі і сваякі ў крызіснай сітуацыі могуць атрымаць экстранную псіхалагічную дапамогу. «Тэлефоны даверу» працуюць у Гродзенскім абласным клінічным цэнтры «Псіхіятрыя-наркалогія» (тэл. 170, кругласутачна) і сацыяльна-педагагічным цэнтры г. Гродна (тэл.165). Распаўсюджанасць псіхасаматычных расстройстваў, як сведчаць прафілактычныя агляды, у дзіцячым узросце дасягае 40—68 працэнтаў. Колькасць абсалютна здаровых у псіхічных адносінах школьнікаў скарачаецца з 30 працэнтаў у першых-трэціх класах да 16 працэнтаў у дзявятых класах.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ІЛЬГОТЫ «МІНУС». БЕЗ ІХ НІЯК?

**Як сведчыць статыстыка, больш за 53 працэнты працуючых грамадзян нашай краіны — гэта жанчыны. Між тым, даводзіцца канстатаваць як факт: менавіта яны аказаліся найменш прыстасаваныя да рынкавай эканомікі. Паводле ацэнак прафсаюзаў, зараз сярэдняя зарплата беларускай жанчыны складае ўсяго каля 80 працэнтаў ад сярэдняга заробку мужчыны. Пры гэтым прадстаўніцы «слабай паловы» складаюць амаль дзве трэці агульнай колькасці беспрацоўных.**

## Сям'я вырашае сама

Удзельная вага жанчын, занятых ў сацыяльным забеспячэнні, культуры, адукацыі, ахове здароўя і іншых бюджэтных галінах, дасягае 83 працэнтаў. Не сакрэт, што ўзровень аплаты працы тут традыцыйна больш нізкі. А адсюль і меншы паказчык сярэдняй зарплаты.

Зрэшты, калі сітуацыя з заробкамі мае аб'ектыўныя тлумачэнні, то прычыны цяперашняга малюнка на рынку працы больш суб'ектыўныя. Агульны ўзровень адукацыі жанчын у нашай краіне вышэйшы. І тым не менш звычайна падчас працаўладкавання перавага аддаецца мужчынам. Значная частка наймальнікаў, асабліва ў прыватным сектары, разумее, што жанчына — гэта дзеці і «незапланаваныя» бальнічныя. А плюс да ўсяго дадатковыя працоўныя «льготы».

— Адно з істотных змяненняў у прынятым сёлета Працоўным кодэксе датычыцца прадастаўлення свабоднага дня ў тыдзень з захаваннем сярэдняга заробку шматдзетным сем'ям і сем'ям з дзецьмі-інвалідамі, — кажа начальнік аддзела народанасельніцтва, сямейнай і гендарнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандра Лісоўская. — Раней права на такую гарантыю мела толькі маці, якая працуе штодзённа поўны тыдзень. Зараз жа сям'я можа выбіраць, хто атрымлівае аплатны «адгул» — маці або бацька.

Не выключаецца нават варыянт, калі льгота па свабодным дні паміж маці і бацькам будзе «чаргавацца», да прыкладу, па кварталах або паўгоддзях — для гэтага неабходна, каб наймальнікі проста абмяняліся загадамі. Прычым практыка паказвае, што цяпер бацька бярэ дадатковы выходны не так і рэдка — прынамсі, каб адвезці на ўласным аўтамабілі дзіця ў бальніцу або ў аздараўленчы цэнтр. Да таго ж варта падкрэсліць: магчымасць карыстацца «лішнім» выхадным ёсць у занятага на ўмовах поўнага дня і поўнага тыдня бацькі ў сем'ях, дзе маці знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, вучыцца, з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам або ўвогуле не працуе.

> **Магчымасць карыстацца «лішнім» выхадным ёсць у занятага на ўмовах поўнага дня і поўнага тыдня бацькі ў шматдзетных сем'ях, дзе маці знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, вучыцца, з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам або ўвогуле не працуе.**

Што ж да водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, то тут права выбару ў працуючых бацькоў існуе даўно. Праўда, заўважаюць у міністэрстве, колькасць мужчын, якія выходзяць у «дэкрэтны», застаецца нязначнай. Адпаведна, нягледзячы на аднолькавыя магчымасці ў заканадаўстве, на рынку працы жанчыны ўсё роўна аказваюцца ў пройгрышы. Таму тэма працоўных ільгот для іх застаецца па-ранейшаму актуальнай.

## Калдагавор — не варыянт

Наша заканадаўства забараняе жанчынам працаваць на цяжкіх работах, для прадстаўніц «слабай паловы» існуюць абмежаванні па пад'ёме і перасоўванні цяжкасцяў, цяжарных жанчын і жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў без пісьмовай згоды забаронена прыцягваць да звышурочных і начных работ. Аднак ці не найбольш важкімі можна лічыць гарантыі па кантрактах.

Зараз наймальнік абавязаны працягваць іх з жанчынамі, пакуль дзіцяці не споўніцца 5 гадоў. Раней, нагадаў намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Аляксандр Мікша, маці маленькіх дзяцей часта звальнялі ў сувязі з заканчэннем тэрміну кантракта амаль адразу пасля выхаду з «дэкрэтнага» водпуску.

Аднак, адзначаюць у прафсаюзах, па-сапраўднаму вострыя праблемы застаюцца. У прыватнасці, у заканадаўстве ўжо не прадугледжана права на дадатковы выходны ў тыдзень для адзінокіх маці з двума малымі дзецьмі. Цяпер такое права можна вызначыць толькі праз калектыўныя дагаворы. І, як вынік, гарантыя прадастаўляецца далёка не паўсюль — многія суб'екты гаспадарання проста не маюць прыбытку. Прычым гэта закранула інтарэсы даволі значнай часткі грамадзян Беларусі — у краіне налічваецца больш за 350 тыс. няпоўных сем'яў.

## Дапамога або водпуск?

Скідваць з рахункаў сацыяльную падтрымку сем'яў з дзецьмі, безумоўна, нельга. Апошнім часам да 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму былі павялічаны аднаразовыя дапамогі пры нараджэнні першага і да 7 БПМ — пры нараджэнні другога і наступных дзяцей. Такая раскладка з'явілася невыпадкова — пакуль 60 працэнтаў беларускіх сем'яў лічаць за лепшае абмежавацца адным дзіцем. Разам з тым, падкрэсліваюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, прэтэндаваць на павялічаную дапамогу могуць не ўсе. У прыватнасці, яе не атрымае жанчына, якая нарадзіла, але пры гэтым была пазбаўлена бацькоўскіх правоў у дачыненні да папярэдніх дзяцей.

Зноў-такі для заахвочвання нараджальнасці змяніліся ўмовы прадастаўлення бясплатнага харчавання на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў. Права на гэту дапамогу цяпер маюць сем'і з даходамі менш за бюджэт пражытковага мінімуму на чалавека незалежна ад занятасці бацькоў. І, да слова, ужо за першую палову года бясплатным харчаваннем было забяспечана больш за 37 тыс. дзяцей — як правіла, з няпоўных сем'яў.

Адно з цікавых новаўвядзенняў гэтага года — прадастаўленне права атрымліваць дапамогу па доглядзе дзіця-інваліда ў тым ліку жанчынам, якія маюць месца працы і знаходзяцца ў «дэкрэтным» водпуску. Нарэшце, таксама сёлета да 80 працэнтаў БПМ узраслі штомесячныя дапамогі па доглядзе дзяцей да 3 гадоў. Пры гэтым іх рост працягнецца. Як паведаміла Аляксандра Лісоўская, на гэты конт ужо падрыхтаваны адпаведны праект — у 2009 годзе памеры «дзіцячых выплат» і бюджэту пражытковага мінімуму павінны зраўняцца.

Між тым, таксама зразумела: нават пасля павышэння пытанні не знікнуць. БПМ на сёння — гэта крыху больш за 224 тысячы рублёў. Грошы невялікія. Таму час ад часу з'яўляюцца прапановы: зрабіць дзіцячыя дапамогі больш важкімі за кошт... скарачэння «дэкрэтнага» водпуску. Скажам, да двух або двух з паловай гадоў.

— Можна пагадзіцца, што памер дапамог на догляд дзяцей да 3 гадоў невысокі, аднак у дадзеным выпадку ўсё залежыць выключна ад фінансавых магчымасцяў, і найбольш рэальны ўзровень у бліжэйшай будучыні — гэта менавіта бюджэт пражытковага мінімуму, — адзначыла Аляксандра Лісоўская. — Што ж да прапановы павелічэння «дзіцячых» за кошт скарачэння «дэкрэтных» водпускаў, то гэта прапанова наўрад ці мае сэнс. Маці ці бацька, якія апынуліся ў складаным матэрыяльным становішчы, могуць спыніць водпуск па доглядзе ў любы час, аддаць дзіця ў садок і выйсці на сваё працоўнае месца. Прычым у выпадку, калі адбудзецца выхад на палову стаўкі, выплата дзіцячай дапамогі працягнецца ў поўным аб'ёме.

**Сяргей ГРЫБ.**

# Беражлівасць са школьнай парты

**Увод у эксплуатацыю Міжнароднага інавацыйнага экалагічнага парка «Волма» намечаны на 2009 год. Па словах намесніка міністра адукацыі Барыса Іванова, экалагічны парк размесціцца на базе вучэбна-навуковага комплексу Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага ўніверсітэта і стане пляцоўкай для дэманстрацыі і шырокага ўкаранення энергазберагальных тэхналогій з выкарыстаннем мясцовых і аднаўляльных крыніц энергіі, такіх, як адходы дрэваапрацоўчай прамысловасці, вецер, сонца, біямаса, энергія рэк і адходы жывёлагадоўлі.**

Атрыманую ад выкарыстання ветру (ветраэнергетычныя ўстаноўкі), сонца (фотаэлектрычныя сістэмы) і вады (мікраГЭС) электраэнергію плануецца выкарыстоўваць для ўласных патрэбаў парка, а яе лішкі перадаваць у раённую энергетычную сетку.

— Мы чакаем ад рэалізацыі праекта не толькі эканамічнага, але і сацыяльнага эфекту, — падкрэсліў Барыс Іваноў. — Сацыяльны эфект будзе заключацца ў выкарыстанні парка для навучання і практыкі студэнтаў, правядзенні там навуковых даследаванняў, а таксама ў развіцці экалагічнага турызму. А эканамічны — у скарачэнні выдаткаў на ўтрыманне парка за кошт атрымання ўласнай электрычнай і цеплавой энергіі.

Плануемы комплекс энергетычнага абсталявання дазволіць атрымліваць у год для ацяплення і гарачага водазабеспячэння інфраструктуры парка каля 1400 Гкал, а таксама каля 15000 кВТЧ энергіі. Акрамя таго гэтыя тэхналогіі цалкам выключаюць забруджванне навакольнага асяроддзя.

Варта заўважыць, што пытаннямі энергазберажэння заклапочаны сёння ўсе ўстановы адукацыі. Так, энергетычны аўдыт паказаў, што рэалізацыя 65 працэнтаў рэкамендаваных ВНУ мерапрыемстваў, напрыклад такіх, як цеплавая рэабілітацыя з устаноўкай энергаэфектыўных шклопакетаў, замена цеплатрас з укладкай ізаляваных труб і г.д. дазваляюць зменшыць страты цяпла да 30 працэнтаў.

Паводле слоў Барыса Іванова, факультатывы па энергазберагальнасці — адны з самых запатрабаваных сярод навучэнцаў школ. Ва ўстановах, дзе рэалізуюцца такія заняткі, ужо падведзены папярэднія вынікі работы. Так, у рамках эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў віцебскіх школах № 6 і № 11 былі распрацаваны крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці работы па энергазберажэнні.

Створаная ў СШ № 6 сістэма работы і праведзенае тэхнічнае пераснашчэнне дазволілі зэканоміць 46 працэнтаў электраэнергіі. У СШ № 12 горада Віцебска даследчая дзейнасць навучэнцаў дазволіла правесці ўласныя разлікі эканоміі электраэнергіі ў школе. Толькі за красавік—май гэтага года эканомія склала 2000 кВт. гадзін, або 860 тысяч рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «МУЖЧЫНЫ БАЧАЦЬ ЖАНЧЫНУ ЗА РУЛЁМ ЗДАЛЁК!»

Ці то для жартаў, ці то на ўзроўні схаванай свядомасці мне давялося ступіць на парог адной даволі вядомай мінскай аўташколы. Прычым — з гонарам. Не, тут справа нават не ў модзе на наяўнасць блакітнай карткі з жудасным фотаздымкам, хутчэй за ўсё, з-за прынцыпу... Мой даволі паважаны знаёмы, які ніколі не меў нічога супраць лепшай палові чалавецтва, выдаў: «Усе нармальныя мужчыны бачаць жанчыну за рулём здалёку!». Уяўляеце? Аказваецца, што жанчына і тармозіць занадта часта, і паварочвае не так, як трэба, і нават пастава ў яе няправільная. Увогуле ўсё мы робім не так, як робіць гэта ідэальны вадзіцель-мужчына.

Аднак, ці з-за жаночага самалюбства, ці з-за настолькі надзённага пытання аб жаночай логіцы, я вырашыла даказаць свайму знаёмаму, што жанчыны дужу на даволі добрай машыне на фоне астатніх, прадстаўленых аўташколамі нашага горада; мае абцасы ўсяго 9 см і мужчына-інструктар на суседнім крэсле. Усміхаецца, недаверліва паглядае на туфлі і дае старт... І ўсе пакрысе пачынаюць рухацца. Здаецца, спакойна з усіх бакоў, і толькі наперадзе гойсае незнаёмай амерыканскай маркі машына. Паводзіць сябе даволі дзіўна, заўважыла нават я, пачынаючы вадзіцель. А што адбывалася з маім інструктарам побач?! Проста крэсла ўжо працёр пад сабой. Вось так мужчына нервуецца.

Гора-вадзіцель уражвае: і тармозіць на сваёй шыкоўнай машыне часта і без неабходнасці, і фары то ўключае, то выключае, і перастройваецца незразумела для чаго... Мне станавілася цікава. Пасля чарговага неадэкватнага дзеяння машыны наперадзе распазнаць жанчыну за рулём здалёку, маюць рацыю.

Але нават калі гэта і так, я ўсё ж такі прытрымліваюся тэорыі, што акрамя бесперапыннай мітусні на сваіх маленькіх модных машынах, жанчыны могуць рабіць і больш элегантныя дзеянні.

Ну, напрыклад, усім вядомы анекдатычны момант пра фарбаванне пазногцяў. А яшчэ напісанне SMS на даволі літаратурнай англійскай мове, чытанне складаных кніг у час шматчасовых затораў. Дык вось. Напэўна, адно, чаго пакуль не робяць жанчыны за рулём, — не гатуюць ежу. І не вяжуць, і не вышываюць. Але зусім не таму, што не ўмеюць, а проста таму, што на сёння гэта не модна!

Па звестках статыстыкі, да слова, жанчыны водзяць намнога акуратней, чым мужчыны. Хоць на чарговых занятках у аўташколе я верыла ў гэта з цяжкасцю... Затое я дала сваёй вучэбнай машыне ласкавае імя, душу ў яе ўклала, можна сказаць! Мужчына ўспрымае машыну як жалеза, а жанчына — як істоту. І менавіта за жаночым метадам кіравання машынай будучыня. Магчыма, не настолькі дакладна, як у нашых ідэальных мужчын, але больш творча. Гэта я і даказала свайму паважанаму знаёмаму з ужо вядомай фразай: «Мужчыны бачаць жанчыну за рулём здалёк!»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

водзяць зусім не няправільна, яны проста падыходзяць да гэтага працэсу творча...

На такой вось пазітыўнай ноце я і заўважыла, што мая група, пад шчаслівым нумарам 7 складаецца не толькі з мужчын: усіх пароўну! «Хоць у лічбах мы наблізіліся! — праскочыла ў галаве.

Напэўна, гісторыю вывучэння тэорыі і агульных пераздачаў я закранаць не буду, але вось гонкі на выжыванне ўсё ж такі пракаментую.

...Я ўпэўнена на ўсе 100. Сямой інструктар не вытрымаў: «Дурніца! Хто так ездзіць?!» І тут я ажывілася: «Гэта яшчэ чаму — дурніца? І як вы вырашылі, што за рулём жанчына?» На гэтыя мае пытанні мой сусед па машыне ўсміхнуўся і дазволіў мне абагнаць амерыканскі шэдэўр і паглядзець, хто за рулём. Сапраўды, маладая прыгожая дзяўчына з бліскучымі ўпрыгажэннямі і тэлефонам у руках зусім не сачыла за дарогай на сваім модным аўтамабілі. І я панікла...

У гэты момант і зразумела: калі мужчыны кажуць, што могуць

**Дзіяна АРЫПАВА.**

# *Падары сэрца хворым дзецям*

Правядзенне дабрачынных акцый для выхаванцаў дзіцячых дамоў, бальніц, рэабілітацыйных цэнтраў, школ-інтэрнатаў — асноўная мэта валанцёрскага руху Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Добрае сэрца». Яму ўжо 2 гады. І на сёння можна прывесці мноства прыкладаў дапамогі хворым дзецям.

Днямі ў Мінску прайшоў злёт валанцёраў маладзёжнага саюза: спецыялісты псіхолагі, прадстаўнікі «Чырвонага Крыжа» і іншых грамадскіх арганізацый, правялі трэнінгавыя заняткі для валанцёраў. Адбылася прэзентацыя выставы па выніках Рэспубліканскага конкурсу дзіцячай творчасці «Святло надзеі», арганізаванага Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. На ёй былі прадстаўлены работы дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама дзяцей, якія апынуліся ў складанай сацыяльнай сітуацыі. Ну і, вядома, валанцёры правялі шэраг дабрачынных мерапрыемстваў. У прыватнасці, у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры дзіцячай анкалогіі і гематалогіі (п. Бараўляны) была арганізавана гульнявая работа з дзецьмі. Тэатралізацыя казкі адбылася ў Ратамскай дапаможнай школе-інтэрнаце. А для малых, якія знаходзяцца на лячэнні ў 2-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы, арганізаваны творчы канцэрт.

Як адзначыў нам **сакратар ЦК БРСМ Максім БОРД**, валанцёрская работа зараз носіць сістэмны характар. За кожнай пярвічнай арганізацыяй ВНУ замацавана адна з профільных медыцынскіх устаноў: дзіцячы дом, інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, дзіцячая бальніца. На пастаяннай аснове актывісты саюза праводзяць у гэтых установах шматлікія акцыі. Паводле слоў Максіма Борда, у кожнай вышэйшай навучальнай установе ёсць валанцёрскія атрады і свая спецыфіка.

Максім Борд перакананы, быць валанцёрам няпроста. І перш за ўсё ў псіхалагічным плане. Адна справа чуць пра чужы боль, другая — бачыць усё на свае вочы. Але маладыя людзі не здаюцца перад складанасцямі, а наадварот, уносяць у сваю валанцёрскую работу крэатыўныя элементы. Да таго ж, на думку сакратара ЦК БРСМ, калі робіш добрую справу, то і сам становішся духоўна багатым. Як запэўніў Максім Борд, валанцёрскі рух БРСМ будзе развівацца далей і маладыя людзі будуць дарыць цеплыню свайго сэрца хворым дзецям.

**Святлана СУХАРКО.**

# ПЛЮСЫ, ПЛЮСЫ І ПЛЮСЫ ШКОЛЬНАЙ ФОРМЫ

**У апошнія гады амаль гамлетаўскае пытанне, быць ці не быць школьнай форме, востра стаіць перад кіраўніцтвамі школ і настаўнікамі. Школьнікі і іх бацькі ўзважваюць усе плюсы і мінусы дзелавога стылю адзення. Гэта паспрабавала зрабіць і я, калі дапамагала збірацца ў школу сваёй сястры. На здзіўленне плюсаў атрымалася шмат, а мінуса ніводнага...**

**ПЛЮСЫ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ:**

● У далёкім 1764 годзе Кацярына II заснавала Смольны інстытут. Для таго каб аб'яднаць студэнтаў інстытута ў адзіную па духу садружнасць, імператрыца адзела іх у аднолькавае адзенне. З таго часу шматлікія школы, ліцэі, гімназіі і інстытуты патрабавалі ад сваіх вучняў і студэнтаў апранацца аднолькава. Гэта аб'ядноўвала іх, дапамагала працаваць гуртам. **Адчуваць сябе ў камандзе** — гэта тое, што неабходна і сучасным школьнікам. Школьная форма ў гэтым можа стаць добрай дапамогай. Духоўнае адзінства параджае вельмі добрыя якасці: адказнасць за сваіх сяброў, пачуццё любові да бліжняга. Жыць у школьнай сям'і вучню стане прасцей і весялей.

● Зайздрасць — гэтая якасць у вучняў узнікае з першага класа. Сусед па парце адзеты ў больш прыгожы касцюм, а сябар рассякае па школе ў дарагіх красоўках. «Чаму я адзеты горш?» — гэтае пытанне ўзнікае ў галаве школьніка і не выходзіць цэлых адзінаццаць гадоў. Школьная форма адкідае гэту праблему. Аднолькавыя сукенкі і пінжакі **выключаюць зайздрасць паміж школьнікамі**. Пачуццё аднолькавасці і роўнасці дапамагаюць вучням сканцэнтравацца на вучобе.

● Купіць фірменныя джынсы і дарагі абутак дзеці з небагатых сем'яў не могуць. Праблема пад назвай «не такі» ці «не такая» для такіх вучняў становіцца сур'ёзней з кожным годам іх вучобы. Аднолькавая форма адзення ў школе **дазваляе дзецям не спазнаць сацыяльную няроўнасць**.

● Сучасны асартымент школьнай формы дазваляе кожнай школе выбраць свой варыянт, прыгожы, зручны і модны. Тым больш, што пры выбары ў першую чаргу ўлічваюцца пажаданні дзяцей і бацькоў. Вам не падабаецца ні адзін варыянт школьнага адзення? Калі ласка, выкажыце свае патрабаванні да колеру, мадэлі і матэрыялу. На ваш заказ будзе сшыта школьная форма. Гэта сёння магчыма. Вучні будуць **выглядаць прыгожа**.

● «У гэтым я была ўчора, а ў гэтым пазаўчора», — так разважаюць школьніцы кожны ранак. Школьная форма **пазбавіць ад вырашэння пытання «што апрануць сёння?»**.

**ПЛЮСЫ ДЛЯ БАЦЬКОЎ:**

● Каб апрануць сучаснага падлетка, бацькам трэба мець тоўсты кашалёк. На маю сястру, вучаніцу дзявятага класа, было затрачана каля 330 тыс. беларускіх рублёў. І гэта не мяжа. Напрыклад, сшыткі з больш прыгожым малюнкам на вокладцы і дзённік з цвёрдым пераплётам каштуюць даражэй. Лічба можа даходзіць да паўмільёна і больш. Увядзенне школьнай формы **дапаможа бацькам зэканоміць** нямала грошай не толькі ў час падрыхтоўкі дзіцяці да школы, але і на працягу года.

● Якая маці не перажывае за сваё дзіця. Бацькі заўсёды імкнуцца, каб іх сын ці дачушка хадзілі ў чыстай, прыгожай і акуратнай вопратцы. Школьная форма звычайна шыецца з нямаркага і ноского матэрыялу. Таму **вучань у школьнай форме заўсёды выглядае акуратна**.

**ПЛЮСЫ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ:**

● Пытанне дысцыпліны ў школе заўсёды стаяла на першых пазіцыях. Шырокія джынсы ў хлопчыкаў і кароткія спадніцы ў дзяўчатак ствараюць дыскатэчную атмасферу. Кідкія колеры адцягваюць увагу і перашкаджаюць засвойваць веды. Ды і пагаварыць пра новыя боцікі сяброўкі больш «цікава», чым рашаць складаныя геаметрычныя задачы. Школьная форма **дысцыплінуе вучняў** і настройвае іх на вучобу.

● **Кантраляваць вучняў у школьнай форме настаўнікам лягчэй.** Адрозніць школьніка ад няшкольніка ў натоўпе вельмі лёгка па школьнай форме, асабліва, калі гэты вучань — прагульшчык.

● Настаўнікі заўсёды імкнуцца выглядаць прыгожа і быць добрым прыкладам для вучняў. Але невялікі заробак не дазваляе ім насіць касцюмы ад Дыёр і сумкі ад Прада. Затое ў фірменным адзенні ў школах часта разгульваюць школьнікі і не грэбуюць пасмяяцца над просценькім нарадам настаўнікаў. Школьная форма **дазволіць настаўніку адчуваць сябе ўпэўнена між вучняў**, апранутых у някідкае адзенне.

**ПЛЮСЫ ДЛЯ ДЗЯРЖАВЫ:**

● Купляючы імпартныя джынсы і красоўкі, мы падтрымліваем замежнага вытворцу. Масавая закупка школьнай формы стане **вялікай падтрымкай для айчыннай лёгкай прамысловасці**.

**Жанна БАЙГОТ, студэнтка ГрДУ імя Я. Купалы.**

# Міжканфесійны хрысціянскі дыялог моладзі

пад назвай «Дзень талерантнасці» прайшоў 4 кастрычніка ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Іаганэса Раў (ММАЦ). Сустрэча ўпершыню была арганізавана для моладзі чатырох хрысціянскіх канфесій: рымска-каталіцкай царквы, рускай праваслаўнай царквы, евангельскіх хрысціян-баптыстаў і лютэранскай абшчыны «Выратаванне». Як паведаміў каардынатар мерапрыемства Аляксандр Ладзісаў, асноўная мэта праекта — наладжванне дыялогу паміж хрысціянскімі цэрквамі і прадстаўнікамі хрысціянскіх цэркваў з мэтай умацавання рэлігійнай згоды, міру і ўзаемапаразумення.

— Унікальнасць гэтага мерапрыемства ў тым, што такая маладзёжная канферэнцыя праводзіцца ўпершыню. Таму яе ўдзельнікі — прадстаўнікі моладзі чатырох канфесій — самі падрыхтоўвалі гэту канферэнцыю і прапрацоўвалі яе тэматыку.

У праграме міжканфесійнага дыялогу, акрамя прэзентацыі канфесій і разважанняў кожнай з іх на тэму: «Як я разумею талерантнасць», была арганізавана і работа ў секцыях «Талерантнасць у сям'і» і «Партрэт талерантнага хрысціяніна». Вынікі канферэнцыі былі абмеркаваны на «круглым стале» пад назвай «Талерантнасць», на якім прысутнічалі духоўныя асобы трох прадстаўленых канфесій.

У планах, па словах Аляксандра Ладзісава, плануецца праект стварэння адмысловай маладзёжнай рабочай групы для правядзення і арганізацыі міжканфесійных праектаў.

**Ілья ЛАПАТО.**

# З ДЗЁННІКА ЗВЫЧАЙНАГА СТУДЭНТА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Я ж казала — зануда. Ну вось, — гэта сама сабе нагадала суседка, якая паміж газетай і канспектам выбрала ўсё ж канспект, але за ўсю лекцыю запісала ў ім толькі прозвішча выкладчыка і тэму.

А выкладчык працягваў:

«На прадмет нашай размовы, у мэтах больш эфектыўнага выкарыстання вольнага часу, як прыкметы найбольш эфектыўнага ўспрымання рэчаіснасці і ў рамках цэласнага абумоўлення рэчаў мабілізацыі ўвагі і пільнасці асобных студэнтаў з нашай аўдыторыі я лічу мэтазгодным весці размову на прадмет стварэння і ўтрымання ў памяці той дэфініцыі, якая была вызначана мною паводле навуковых абгрунтаванняў вучоных і даследчыкаў у навуковых крыніцах: прыродазнаўства — гэта ве-ельмі важная навука. Увогуле, гэта сукупнасць найбольш абумоўленых...»

**ЧАС: ДА КАНЦА ЛЕКЦЫІ 15 ХВІЛІН**

«...Яшчэ Гіпакрат казаў, што...»

— Выпусціце нас. Калі ласка, — голасам-мальбой, бы залатая рыбка ў сетцы дзядулі-рыбака просіцца адна са студэнтак.

Але выкладчык, прывучаны заўсёды адпрацоўваць свой час, сумленна дачытвае лекцыю, і спадзеючыся, відаць, на тое, што студэнты ўсё ж запомняць дэфініцыю курса, ён у чарговы раз яе паўтарае.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ЧАС: ДА КАНЦА ЛЕКЦЫІ 5 ХВІЛІН**

Цямнее на вуліцы. У сектары гламурных прыгажунь пралістаныя ўжо ўсе глянцавыя часопісы і па дзесяць разоў абмеркаваныя апошнія факультэцкія навіны. Выкладчык ужо як родны чалавек. Сектар звышактыўных таксама маўчыць: сілаў няма нават на пытанні. Прачытаныя ўсе газеты, прадуктовыя запасы таксама скончыліся. Аднагрупніца Зіна таксама ўжо давязала апошнюю шкарпэтку... Дзяўчынкі-выдатніцы, якія сядзяць звычайна на першых шэрагах, таксама паклалі ручкі ў канспект... А чацвёртай пары няма ні канца, ні краю.

У такія хвіліны на гадзіннік пазіраеш усё часцей, але секундная стрэлка ад гэтага чамусьці не паскараецца. Пачынаеш лічыць. Трыццаць шэсць. Трыццаць пяць. Трыццаць чатыры. Трыццаць тры...

* * *

Выйсці з аўдыторыі можна таксама па-рознаму. Тут толькі два варыянты: альбо вылятаючы, альбо выпаўзаючы. Так ці інакш, але выходзячы з лекцыі, бярэш з сябе абяцанне, што на такую лекцыю ты больш ні нагой. Але, як паказвае практыка, «інстынкт першакурсніка» (чытай: сумленнага студэнта) усё адно пераможа. І праз тыдзень на той жа лекцыі аднагрупніца Зіна пры табе пачне вязаць ужо новую партыю шкарпэтак. А гэта значыць, што нікуды ты не дзенешся: дэфініцыю вывучаемага курса давядзецца запомніць. Бо нават Гіпакрат казаў!

**Ілья ЛАПАТО.**

# Паважаныя беларусы, памятайце званне сваё!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Я люблю беларускую мову, — прызнаецца Тамара Марозава, — вывучала яе ў школе, у мяне былі цудоўныя выкладчыкі ва ўніверсітэце: Мікола КАВАЛЕНКА і Марыя КАРПОВІЧ. І я рада, што маю дачыненне да таго, каб мова гучала ў горадзе. Хоць пераклад мне часта даводзіцца рабіць у дадатак да асноўнага свайго занятку, гэта адымае час і не заўсёды бывае да месяца. Часам я звяртаюся па дапамогу на факультэт журналістыкі БДУ альбо да стыліста газеты «Звязда» Валянціны КУДЗІНАЙ. І вельмі ўдзячная апошняй, што нягледзячы на сваю занятасць, яна ніколі не адмаўляе, бывае, што сама перазвоньвае і ўдакладняе, у якім слоўніку знайшла тое альбо іншае слова. «Звязду», між іншым, мне парэкамендавалі на факультэце як узор добрай мовы. А выпадкі бываюць даволі складаныя.

Такім чынам, на сёння пераклад на беларускую мову — гэта не толькі чыясьці добрая ініцыятыва, але часта яшчэ і добраахвотны бязвыплатны клопат. Значыць, ёсць у нашым жыцці рэчы, за якія людзі не чакаюць узнагароды. І калі такой з’яўляецца родная мова... Як хочаце, але я бачу ў гэтым нейкі вышэйшы знак.

У КУП «Мінскі метрапалітэн» надпісы на вагонах і станцыях «уваход» і «выхад» былі перакладзены на беларускую мову таксама параўнальна нядаўна, гадоў 3-4 таму. Тады ж было вырашана дубляваць па-беларуску рускамоўную інфармацыю, якая паведамляецца на станцыях.

А вось аб’явы ўнутры электрацягнікоў прамаўляюцца на роднай мове з пачатку 90-х. Гэта тычыцца ўсёй інфармацыі, акрамя рэкламнай, унутры рухомага саставу. Дарэчы, з апошняй звязана камічная гісторыя. Калі адкрылі станцыі «Уручча» і «Барысаўскі тракт», нехта з пасажыраў звярнуўся да кіраўніцтва метрапалітэна са скаргай на тое, што ў тэкстах ёсць памылкі. У правілах карыстання метрапалітэнам іх колькасць раўнялася... пяцідзесяці(!). Прычым гэтыя правілы былі змешчаны ўнутры цягнікоў з тымі ж самымі памылкамі больш за 10 гадоў, але заўважылі іх толькі цяпер.

— З дапамогай Таварыства беларускай мовы мы на працягу трох дзён выправілі ўсе памылкі і змянілі надпісы, — кажа начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела электрадэпо «Маскоўскае» Аляксандр ХОМІЧ.

Яшчэ адна прыкметная, нават кідкая, крыніца роднай мовы — рэклама. На жаль, не многія рэкламадаўцы шукаюць шлях да сэрца спажыўца з дапамогай беларускіх слоў. Але некаторыя робяць гэта свядома і даволі ўдала. Акрамя некалькіх, усім вядомых буйных фірмаў, якія прынцыпова рэкламуюць сябе толькі на тытульнай мове краіны, у якой прапануюць тавар, нядаўна на нашым рынку з’явіўся новы брэнд, рэкламны тэкст якога не проста перакладзены на беларускую мову, але і цікава абыграны: «ПрыWATTны інструмент — ладная праца».

— Наша кампанія свядома пайшла на гэта па дзвюх прычынах, — тлумачыць начальнік аддзела маркетынгу ТАА «Сувязьпрамінвест» Сяргей. — Па-першае, каб вылучыцца. Бо і гэта, зразумела, на жаль, беларускамоўная рэклама ў Беларусі — рэдкасць. Па-другое, мы бачым нашага спажыўца як мужчыну ад 20 да 65 гадоў, і лічым, што да гэтай аўдыторыі мае сэнс звяртацца па-беларуску. Да таго ж, хоць інструмент, які мы прапануем, вырабляецца ў розных краінах, але сам брэнд, пад якім мы яго прадаём, — беларускі.

Дарэчы, выкарыстоўванне беларускай мовы нават у камерцыйных мэтах — таксама своеасаблівы альтруізм. Бо далёка не кожнае рэкламнае агенцтва здолее перакласці рэкламны тэкст так, каб ён гучаў і выглядаў прыгожа і адэкватна.

— Тут трэба, каб людзі не проста ўмелі карыстацца слоўнікамі, а думалі па-беларуску, — заўважае маркетолаг. — З дзесяці агенцтваў толькі адно ўзялося за такую работу. Мы сутыкнуліся таксама з праблемай перакладу тэхнічных тэрмінаў. Нам давялося звяртацца ў Інстытут мовы і літаратуры, каб перакласці «шурупаверт» на «шрубавёрт». І мы вельмі ўдзячныя за дапамогу. Але ў далейшым тэхнічныя характарыстыкі, напрыклад у буклетах, збіраемся пакідаць усё ж па-руску, а на беларускай даваць агульную інфармацыю і слоган.

Я спытала Сяргея, якое месца беларуская мова займае ў яго жыцці, і са здзіўленнем пачула наступнае:

— На жаль, не шмат, бо я нарадзіўся і 30 гадоў пражыў у Расіі. Аднак я не магу заставацца абыякавым да таго, што тут, у Беларусі, беларуская мова амаль не гучыць. Для мяне яна — цікавая і прыгожая.

**А ДЛЯ ВАС?**

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ДЭФІЦЫТНАЯ МОВА




На вуліцах Магілёва беларуская мова амаль што незаўважная. Сярод абсалютна пераважнай колькасці рускамоўных шыльдаў вылучаецца «Моладзевая вопратка і адзенне» на бульвары Леніна. На некаторых сіне-белых кіёсках «Магілёўсаюз-друку» назва прадпрыемства напісана па-беларуску. На гістарычных будынках Магілёва ёсць беларускамоўныя мемарыяльныя дошкі. У адной з самых папулярных прыватных майстэрняў па рамонце і пашыве адзення квіткі зроблены з выкарыстаннем беларускай мовы.

У грамадскім транспарце абласнога цэнтра назвы прыпынкаў аб’яўляюць па-беларуску. Але пачуць больш працяглы тэкст на роднай мове можна толькі ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры. Праўда, і там яна ў дэфіцыце.

Сёння ў рэпертуары Магілёўскага тэатра — толькі тры спектаклі на беларускай мове. П’еса С. Кавалёва «Легенда пра Машэку» расказвае прыгожую гісторыю ўзнікнення Магілёва. «Трыстан і Ізольда» — сярэднявечны рыцарскі раман, пакладзены на беларускую мову. Яго, дарэчы, паказвалі на сцэне ў Расіі, і беларуская мова зусім не стала бар’ерамі паміж акцёрамі і цалкам рускамоўнай глядацкай залай.

І, нарэшце, трэці спектакль на беларускай мове: прэм’ера мінулага тэатральнага сезона ў Магілёве — пластычны спектакль «Яна і я» паводле паэмы Янкі Купалы. Праўда, наўрад ці ён з’явіцца на афішах новага сезона: у тэатры спасылаюцца на кадравыя змены і, нягледзячы на цікаўнасць да спектакля крытыкаў, стрыманае стаўленне да наватарства гледачоў.

— Хацелася б мець болей спектакляў на беларускай мове, — прызнаў загадчык літаратурна-драматычнай часткі тэатра Цімафей Яравікоў. — Але калі казаць аб’ектыўна і шчыра, то ўсё ж на беларускую мову ў тэатры гледачы маюць, так бы мовіць, прадузяты погляд.

Звычайна такую сітуацыю тлумачаць тым, што Магілёўскі драмтэатр, якому сёлета споўнілася 120 гадоў, быў за савецкім часам Рускім тэатрам. А таксама не забываюцца і на памежнае з Расіяй геаграфічнае становішча Магілёўскай вобласці.

— Невялікая частка беларускамоўных спектакляў у нашым тэатры — гэта, на мой погляд, не вельмі добра, — працягвае Цімафей Яравікоў. — І я спадзяюся, што сітуацыя зменіцца. Нядаўнія гастролі Віцебскага таэтра, які прадставіў у Магілёве беларускамоўны рэпертуар, паказалі, што публіка ахвотна ідзе на спектаклі і нічога не мае супраць роднай мілагучнай мовы. І тое, што «Трыстан і Ізольда» і «Легенда пра Машэку» трымаюцца ў нашым рэпертуары больш за пяць гадоў, сведчыць пра тое, што глядацкі попыт на добрыя беларускамоўныя спектаклі ёсць. Добра было б прывіваць культ роднай мовы з дзяцінства.

**Ілона ІВАНОВА.**

# MEGA мова з адчуваннем «міксу»




Вядома, Гомельшчына — адна з самых рускамоўных абласцей Беларусі. І пытанне — наколькі часта сустракаецца ў побыце беларуская гаворка — можна лічыць рытарычным. Ёсць лічаныя людзі, якія размаўляюць на беларускай літаратурнай заўсёды. Часцей яе ўжываюць таму, што так трэба: напісаць артыкул, правесці лекцыю, прачытаць выпуск у эфіры абласнога праваднога радыё (FM — выключна па-руску), або «выпендрыцца» веданнем двух дзясяткаў слоў перад кім-небудзь. Між іншым, у апошнім выпадку часцей за ўсё адразу зразумела, што вымаўленне вымучанае, з асаблівым націскам на «г», «ч», «шч», «дз», «дж».

Пабачыць шыльду на беларускай мове можна заўсёды толькі на ўстановах адукацыі і прадпрыемствах «Белпошты». Вось звычайная з’ява: афіцыйная шыльда дзвюхмоўная, надпіс «Гомельское ГПТУ-79», а пад ім — «Сардэчна запрашаем». Але ж, калі зойдзеш у памяшканне, пабачыш вялікую колькасць аб’яў — зноў жа толькі на рускай мове.

Далей — слуп ля пешаходнага пераходу. Пад святлафорам — «Будзьце ўважлівымі», а ніжэй — «Для перехода нажмите кнопку. Ждите». Назвы вуліц у Гомелі сустракаюцца выключна на рускай мове.

Праедзем у аўтобусе. «Наступны прыпынак — фабрыка ВАСЬМОВА сакавіка». Вось так ставяць націск — «па-гомельску». Пры тым, што звычайна менавіта ў аўтобусе аб’явы гучаць — па-беларуску. У тралейбусным парку свае правілы — аб’явы па-руску.

Заходжу ў звычайны «маркет». Гэта вам не крама і нават не магазін — тут цікавы матэрыял для даследавання. Вось прадукцыя з брэндам «Витьба». Губляюся — гэта па-руску ці як? Чытаю далей: «Хлеб «Пралесак» (нарезанный), пудинг «Ласунак» с ароматом земляники, колбаса вареная «Верасеньская», 2 сорт; тушка цыплёнка-бройлера «Асобіна» смачная прысмака». На фірменнай упакоўцы: «Белорусский шоколад», «Бело-вежская пуща» — ніжэй для іншаземцаў — варыянт на англійскай мове. Далей — яшчэ больш займальны маркетынгавы ход. Чыпсы беларускай вытворчасці: «MEGA CHIPS Мега Чипсы картофельные со вкусом барбекю». Рэкламная шыльда: «СЯБАР пивоваренная компания». У аддзеле побач — прадукцыя вядомай беларускай касметычнай фірмы. Лацінскімі вялізнымі літарамі — назва, а маленькімі на рускай — прызначэнне прадукцыі.

Зноў вяртаюся да прадуктаў. Вось мінеральная вада з Украіны. Яе вытворцы не сароміюцца сваёй мовы і на этыкетцы не знойдзеш слова па-руску ці па-беларуску. І так зразумееце, лічаць нашы суседзі: «Моршинська негазована вода», «Львівське преміум», «Чернігівське світле». А побач — «Светлое пиво речицкое янтарное»...

І нават калі ўкраінская прадукцыя на ўпакоўцы вызначана як «Крабовые палочки» і «Рыбные бургеры», ніжэй — усё роўна свой варыянт: «Крабові палички» и «Рибні бургери». Каб дакладна ведалі, з якога мора істоты прыплылі на нашы прылаўкі.

Напрыканцы — у кніжны магазін. Літаратуры і канцылярскіх тавараў — бяры — не хачу! Усё — рускамоўнае. І толькі ў самым кутку — літаральна дзве шафы з надпісамі — «Выдавецтвы Беларусі прапануюць» і «Беларуская навука». Дзіцячыя кніжкі ёсць таксама, але ж — не больш за дзясятак. Як жа дзеці будуць ведаць родную мову, яны ж не ўспрымаюць яе як жывую!

Прынамсі, калі рыхтавала матэрыял, патэлефанавала спецыялістам — настаўнікам і выкладчыкам беларускай мовы. Аб праблеме яе ўжывання мы размаўлялі па-руску...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ПАЧЫНАЕЦЦА З ДЗІЦЯЧАГА САДКА...

**Нядаўна на імпрэзе, прысвечанай адкрыццю Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы, давялося ўбачыць выступленні двух творчых калектываў з цудоўным беларускамоўным рэпертуарам — гуртоў «Прымакі» з Беласточчыны і «Бяседа» з Мінска. Ды і на розных фестывалях, асабліва звязаных з народнай творчасцю, беларуская мова даволі папулярная. Але куды ж яна знікае, калі за святочнымі мерапрыемствамі надыходзяць звычайныя будні?**

І не скажаш жа, што матчына, як мы часта гаворым, мова выклікае нейкую «алергію» ў тых жа жыхароў Гродна. Магу аб гэтым сведчыць на падставе шматлікіх інтэрв’ю з самымі рознымі людзьмі. Так, пераважная большасць суразмоўцаў гаварылі па-руску. Аднак не памятаю выпадку, каб пры азнаямленні з тэкстам будучай газетнай публікацыі (ужо, зразумела, на беларускай мове) хтосьці нешта не зразумеў. А вось ацэнкі, што, маўляў, як жа прыгожа тое ці іншае слова гучыць у беларускім «варыянце», даводзілася чуць неаднойчы. Значыць, падабаецца, ёсць карані. Але не трэба цешыць сябе асаблівымі ілюзіямі, што пасля гэтага інтэрв’ю чалавек загаворыць па-беларуску. Моўнае асяроддзе (хоць і робяцца пэўныя крокі па яго беларусізацыі: шыльды з назвамі вуліц, аб’явы ў грамадскім транспарце...) бярэ сваё.

Такім чынам, не ўсе, але многія дарослыя прызвычаіліся да таго, што беларуская мова быццам госця ў сваёй жа хаце і наўрад ці заклапочаныя тым, каб нешта змянілася. Але як жа дзеці?

Паводле інфармацыі начальніка аддзела адукацыі Гродзенскага гарвыканкама Сяргея Блажэя, сёлета разам з бацькамі (14 чалавек) паспрабавалі арганізаваць на базе дзіцячых дашкольных устаноў групы на беларускай мове. Адпаведныя аб’явы размяшчаліся ў тралейбусах, аўтобусах, мясцовай прэсе. Але, на жаль, не атрымалася. Прычына, верагодна, у тым што не створана дакладная сістэма беларускамоўнай адукацыі на ўсіх этапах: дзіцячы садок, школа, сярэднеспецыяльная і вышэйшая навучальныя ўстановы. І бацькі апасаюцца, што ў дзяцей, якія вывучаюць усе прадметы па-беларуску на першых этапах адукацыйнага працэсу, узнікнуць цяжкасці на заключным.

— Мы гатовыя стварыць зручныя ўмовы для бацькоў, каб адзін такі дзіцячы садок быў у Ленінскім раёне, а другі — у Кастрычніцкім, — гаворыць Сяргей Блажэй. — Работа ў гэтым накірунку будзе прадоўжаная. Пакуль жа ў Гродне толькі два дзіцячых садкі, дзе большасць мерапрыемстваў імкнуцца праводзіць на беларускай мове. А што тычыцца агульнаадукацыйных школ, то ніводнага класа, дзе ўсе прадметы выкладаліся б па-беларуску, у горадзе на сёння не існуе. Нават тры школы, якія прынялі ў сувязі з далучэннем да абласнога цэнтра часткі тэрыторый Гродзенскага раёна, і тыя рускамоўныя.

У сувязі з адменай профільнага навучання ў агульнаадукацыйных школах цяпер няма класаў з паглыбленым і павышаным вывучэннем беларускай мовы. На змену прыйшлі факультатывы. У Кастрычніцкім раёне са 120 настаўнікаў беларускай мовы (18 школ) у факультатывах задзейнічаны 100 чалавек з агульнай колькасцю гадзін — 179 у месяц. У Ленінскім раёне (19 школ) — 90 са 124 настаўнікаў, 126 гадзін.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Пачын аўтапарка і асобнага кандуктара


Таццяна КЛІМУК.

Скажу адразу, у Брэсце вельмі рэдка можна пачуць беларускую мову. Мала яе на шыльдах, плакатах, расцяжках, рэкламных палотнах. Апраўданні заўсёды знаходзяцца: так гістарычна склалася, Брэст — на памежжы, цераз мост — тут Польшча, цераз дарогу — Украіна. Жывём на мяжы, а ў суседзяў не вучымся. Як толькі гэту мяжу перасякаеш, адразу беспамылкова вызначаеш, у якую краіну трапіў. Па шыльдах на крамах, на ўстановах, па вулічных надпісах. У нас яшчэ далёка да гэтага. У нас, як на што і адважацца, то не да канца, напалову. Так, над галоўным магазінам горада свецяцца два словы, напісаныя вялікімі літарамі «Сардэчна запрашаем», і адразу над імі — «Центральный универмаг». Яшчэ адзін прыклад такога ж кшталту «Детский универмаг «Буслік». Двухмоўе, што тут скажаш...

Але сказаць, што зусім нічога не робіцца на ніве распаўсюджання мовы, таксама будзе няправільна. У паштовых аддзяленнях, бібліятэках, іншых установах культуры часта даводзілася сустракаць нагляднасць менавіта на роднай мове. Прыемна, што адкрыццё тэатральнага фестывалю «Белая вежа», куды з’язджаюцца прадстаўнікі больш дзесятак краін, праходзіць па-беларуску. Галоўны дакумент фэсту — маляўнічы буклет — выпускаюць на беларускай і англійскай мовах. У кожнай з двух нашых вышэйшых навучальных устаноў ёсць выкладчыкі, якія чытаюць лекцыі па матэматыцы, гісторыі, іншых дысцыплінах на роднай мове. Але ўсё гэта адзінкавыя факты ўласнай ініцыятывы.

А вось што ўсяляе некаторую надзею, дык гэта пачын некаторых устаноў і прадпрыемстваў. Так, у галоўным упраўленні ідэалагічнай работы аблвыканкама раз на тыдзень супрацоўнікі гавораць па-беларуску. Беларускія серады ўвёў начальнік упраўлення Аляксандр Рагачук, каб работнікі маглі практыкавацца ў вуснай гаворцы. І сапраўды, якія ж гэта ідэолагі, калі яны не ведаюць першай дзяржаўнай мовы краіны?

Не так даўно на беларускай мове «загаварыў» увесь Брэсцкі аўтобусны парк. Ва ўсіх маршрутных аўтобусах прыпынкі і іншая абавязковая інфармацыя аб’яўляецца на добрай роднай мове. Машыны аснашчаныя спецыяльным вяшчаннем. Вадзіцелю дастаткова націснуць кнопку, і дыктарскі голас зробіць патрэбную аб’яву. А раней, каб пачуць родную мову ў транспарце, трэба было заехаць у Мінск і спусціцца ў метро. А ў брэсцкіх тралейбусах вяшчанне ідзе па-ранейшаму...

У аўтобусы ж «пасяліў» роднае слова дырэктар аўтапарка Вячаслаў Мельнічук. Ёсць у гэтым калектыве яшчэ адзін чалавек, які сваім уласным прыкладам, на сваім рабочым месцы, у асяродку сям’і і суседзяў прапагандуе і распаўсюджвае роднае слова. Але аб усім па парадку.

Аўтару гэтых радкоў часта даводзіцца ехаць на працу — з працы аўтобусам 15-га маршрута. На гэтым маршруце ў салоне працуюць кандуктары. І вось аднойчы заходжу і чую: «Шаноўнае спадарства, калі ласка, набывайце білецікі. Хто не разлічыўся за праезд?» Другі раз бачу гэтага ж кандуктара ў кампаніі маладых людзей, якія спрабуюць «качаць правы» і з яўным беларускім акцэнтам патрабаваць, каб з імі размаўлялі на «нармальным языке». Спачатку кандуктар угаворвае хлопцаў, спрабуе нешта давесці ім пра нацыянальную свядомасць, але ў рэшце рэшт раіць ім вазіць персанальнага перакладчыка. Такіх пасажыраў, паводле слоў Таццяны Клімук, у яе меншасць. Большая частка ўсё ж на беларускае слова адказвае ўсмешкай, добразычлівасцю.

Таццяна Анатольеўна вырасла ў рускім асяродку. Па-руску размаўляў дзед-святар, бацькі. А натхніла да роднага слова пачуццё пратэсту. На яе папярэдняй рабоце адзін з непасрэдных начальнікаў дэманстраваў адкрытую пагарду да ўсяго беларускага. Тады і задумалася, тады ўспомніла ўрокі роднай мовы цудоўнай настаўніцы Вольгі Андрэеўны Агурцовай. Паводле вызначэння Таццяны, прыйшла да гэтага, як часам прыходзяць да рэлігіі, да ўсведамлення перамены прывычнага ладу жыцця... Дома матулю падтрымала дачка-васьмікласніца, дзяўчынка нават спрабуе пісаць вершы.

Ну а на рабоце паявіліся пасажыры, якія яе пазнаюць, вітаюцца, стараюцца падтрымаць размову на роднай мове. І адразу расцвітаюць усмешкі, паяўляецца настрой на новы дзень.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# НЕ ЎМЕРЛІ... І НЕ ПАМРОМ!

Спрэчныя зацемкі

**Сітуацыя з беларускай мовай — праблема не сённяшняга дня. Яна губляецца ў мінуўшчыне — нашай гісторыі. Адна з прычын у тым, што доўгі час народ заставаўся без нацыянальнай арыстакратыі і інтэлігенцыі. Але мінулае не перайначыш, а найбольшую цікавасць мае сучаснасць, бо яна фарміруе будучыню.**

Сёння беларуская мова жыве сама па сабе: не прапагандуецца, але і не забараняецца. А ў такой сітуацыі кожны, быццам бы, мае права выбраць, на якой мове гаварыць. Перавага аддаецца рускай — паўсюдна ў дзяржаўных установах карыстаюцца ёю.

Наш чалавек спакон веку падстройваўся пад пана. Калі той гаварыў па-польску, то і ён імкнуўся яго пераняць, а калі па-руску, то гэтаксама. Мужык бачыў, што той жыве лепш, вось і цягнуўся... а сёння пана замяніў начальнік. Але паслухайце, як іншы чыноўнік гаворыць з трыбуны ці выступае па тэлебачанні — беларускую забыў, а рускай не навучыўся. А ў прынцыпе многае залежыць ад пазіцыі канкрэтнага чалавека. Вось у інтэрнэце ёсць сайт Столінскага раёна — інфармацыя была на беларускай мове, а сёння зірнуў — ужо на рускай. Сёння так, а заўтра гэтак — як каму захочацца... У Баранавічах на гарадскім транспарце прыпынкі аб’яўляюць па-беларуску, людзі да гэтага прывыклі і ўжо здаецца, што так заўсёды было.

За кожным такім крокам стаіць канкрэтны чалавек, кіраўнік.

З шыльдамі і рознай інфармацыяй сітуацыя склалася абуральная. Прыватнік на свой «шопік» вешае ўсё, што яму ўздумаецца — піша шыльды на розных мовах, акрамя беларускай. У Баранавічах на цэнтральных вуліцах: імя Леніна, Камсамольскай, Савецкай першыя паверхі ўжо ў руках прыватнікаў і складваецца ўражанне, што ты апынуўся ў расійскай глыбінцы. Тут «Лакомка», а там «Сластена» — штамп паўсюдна... Зазірнеш у газету, а там ад «бурёнок» хоць хавайся.

Ёсць і выключэнні. Вось у Баранавічах некалькі буйных прыватных магазінаў маюць назву «Цвік», а каля стадыёна — прадуктовы «Калі ласка» — гэта пазіцыя гаспадара магазінаў.

Мне заўсёды прыемна бываць у Ганцавічах. На ўсіх мерапрыемствах, звязаных з культурным жыццём ды і не толькі, кіраўнік раёна Уладзімір Столяр выступае па-беларуску, а калі жаніў сына, то на вяселлі спяваў мясцовы самадзейны калектыў у нацыянальных строях (у Ганцавічах за невялікія грошы можна на нейкую сямейную ўрачыстасць запрасіць спевакоў).

— А як інакш, мне было б сорамна перад сабою, — сказаў аднойчы старшыня райвыканкама.

Дарэчы, многія кіраўнікі ведаюць родную, але...

А якія былі б Дажынкі, каб там не гучалі народныя песні?!

Аднойчы іду па вул. Леніна і бачу, як знаёмы мастак манціруе на магазін шыльду.

— А чаму не па-беларуску?

— Ды так начальства загадала, — кіўнуў той на дзверы.

Зазірнуў да загадчыцы магазіна, а жанчына аж змянілася з твару: «Ды ніякай размовы не было. Мне галава не баліць, якое там «і» будзе напісана». Думаю мастаку, таксама, не прыйшло ў галаву, што ёсць моўны выбар. Мінулае ў нас сядзіць глыбока і пазбавіцца ад комплексу непаўнацэннасці нялёгка. Гэтае пачуццё праследуе нас многія пакаленні.

І ў плане стаўлення да роднай мовы беларусы ў Еўропе стаяць асабняком. А разам з гэтым, хіба ж мала ў нас пакінутых дзяцей?! І тут я скажу сакраментальныя, у многім, можа, спрэчныя, словы. Усё ў свеце ўзаемазвязана. Лёс чалавека, народа, як і цывілізацыі трымаецца на гэтай узаемасувязі. Кінутыя дзеці і забытая мова — гэта адно цэлае. Пакажыце мне краіну, у якой моцныя нацыянальныя традыцыі і дзясяткі тысяч дзяцей у інтэрнатах пры жывых бацьках.

Нельга пабудаваць моцную і квітнеючую Беларусь без гісторыі, культуры, мовы тытульнай нацыі. Але калі зрабіць адпаведныя захады на дзяржаўным узроўні, то праз пяць гадоў працэс адраджэння беларускай мовы будзе незваротным.

І ўсё ж не гледзячы на ўсе мінусы, я настроены аптымістычна. Якія салідныя выданні па гісторыі і культуры на паліцах кніжных магазінаў! Вось двухтомная энцыклапедыя Вялікага Княства Літоўскага — дарагавата, але ж выданне цудоўнае. За савецкім часам пра такое і не марылі.

А ўспомнім апошні перапіс насельніцтва. Хто мог падумаць, што больш за 80 працэнтаў жыхароў назавуць беларускую мову роднай!

— Ад цябе слова па-беларуску не пачуць, а ты пішаш «родная», — спытаўся ў знаёмай.

— Сумленне не дазволіла, — быў адказ.

І гэта, бадай, самы моцны аргумент у абарону мовы.

Хацелася б, каб Беларусь была суверэннай, каб беларуская мова паўсюдна гучала, каб... але патрэбен час. Мы павінны яшчэ ўсвядоміць сябе грамадзянамі сваёй краіны. Захаваем дзяржаву — адродзім мову.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

* * *

*Мы лічым сваім доўгам падтрымаць тых, хто дапамагае роднай мове. Гэта свайго роду падзяка і выказванне павагі. Мяркуем, што сённяшні аповед — толькі пачатак. І нам шмат яшчэ будзе пра каго расказаць і каму пацісьнуць руку. Не толькі віртуальна.*

# ЗАГІНУЎ У ПАЛОНЕ

Ваенны архіў



**У гэту суботу, 11 кастрычніка, яшчэ каля 200 беларусаў, што пражываюць як на тэрыторыі краіны, так і за яе межамі, атрымаюць копіі трафейных картак — дакументы, якія сведчаць аб дакладных даце і месцы пахавання сваякоў з ліку колішніх ваеннапалонных, што загінулі падчас Вялікай Айчыннай у лагерах, размешчаных на тэрыторыі Германіі.**

Паводле слоў начальніка аддзела Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, кандыдата гістарычных навук Ігара ВАЛАХАНОВІЧА, камітэт працуе над вывучэннем архіўных матэрыялаў, якія датычацца ваеннапалонных, з 2002 года. Цяпер вядома, што на ўсіх ваеннаслужачых Савецкай Арміі, якія траплялі ў палон, афармляліся спецыяльныя карткі, дзе была змешчана інфармацыя агульнага кшталту — прозвішча, імя, імя па бацьку, дзень і месца нараджэння, месца службы, воінскае званне, час, калі трапіў у палон, звесткі аб перамяшчэнні па нямецкіх лагерах, а таксама аб тым, калі памёр і дзе пахаваны.

Пасля перамогі пэўная частка такіх картак аказалася на тэрыторыі Савецкага Саюза ў якасці трафеяў, з-за чаго яны ўласна і называюцца трафейнымі. Карткі былі размеркаваныя па архівах органаў дзяржбяспекі па тэрытарыяльным прынцыпе — накіроўваліся ў тыя мясцовыя архівы, дзе нарадзіўся чалавек. Так, зараз у Цэнтральным архіве КДБ знаходзяцца архіўныя дакументы ў дачыненні да ўраджэнцаў Мінска і Мінскай вобласці, у Віцебскай вобласці — дакументы на віцябчан і г.д. Толькі ў Магілёўскай вобласці дадзены архіўны фонд яшчэ ў 1994 годзе быў перададзены ў Дзяржаўны архіў вобласці.

Карткі ваеннапалонных ёсць, вядома, не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, ва Украіне, Казахстане. Напрыканцы 90-х германскае няўрадавае аб’яднанне «Саксонскія мемарыялы ў памяць ахвярам палітычнага тэрору» заключыла пагадненне аб сумесным вывучэнні вышэйзгаданых дакументаў з расіянамі. У расіян, дарэчы, апошнія захоўваюцца не толькі ў архівах органаў дзяржбяспекі, але і ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны, які знаходзіцца ў горадзе Падольску. Нямецкі бок заключыў пагадненне і з ФСБ, і з Мінабароны. Гэта быў пачатак міжнароднага праекта па вывучэнні архіўных дакументаў, якія датычацца савецкіх ваеннапалонных, што загінулі на тэрыторыі Германіі.

— Галоўная мэта гэтага праекта — высветліць, колькі чырвонаармейцаў апынулася ў палоне, колькі з іх там загінула, — тлумачыць Ігар Валахановіч. — Не сакрэт, што сваякам ваеннапалонных паведамлялася, што той прапаў без вестак. Хтосьці сапраўды гінуў у баі і быў пахаваны ў брацкай магіле, але тут — іншая справа. Людзі трапілі ў палон і там загінулі — ад работы, хваробаў, былі забітыя... Але яны не былі здраднікамі... У гэтых картках часам пісалі «адпушчаны ў гестапа». Раней думалі, што гэта фраза ўказвала на магчымае супрацоўніцтва з фашыстамі. На самай справе гэта азначала, што чалавек знімаецца з «уліку» — вынішчаецца...

Да гэтай работы далучылася Украіна, а з 2002 года вывучэнне трафейных картак савецкіх ваеннапалонных пачалося і ў Беларусі. Усе карткі скануюцца і захоўваюцца на электронным носьбіце. На сёння супрацоўнікамі КДБ апрацавана звыш 20 тысяч картак больш як на 12 тысяч савецкіх ваеннапалонных. Уся гэта інфармацыя перадаецца нямецкаму боку, і такім чынам ствараецца агульны банк даных.

У самой Германіі таксама праводзіцца адпаведная работа. Цяпер там ёсць архіў са звесткамі больш як на 50 тысяч савецкіх ваеннапалонных.

Першая спроба шырокага агучвання апрацоўкі дакументаў адбылася ў нашай краіне ў 2006 годзе, у Магілёўскім аблвыканкаме. «Мы зрабілі выбарку з банка даных, вылучылі звыш 1 тысячы трафейных картак на ўраджэнцаў Магілёва і Магілёўскай вобласці, якія загінулі ў нямецкім палоне, — кажа Ігар Валахановіч. — Надрукавалі гэтыя спісы, у выніку чаго адгукнуліся сваякі 55 чалавек, якім і былі перададзены копіі трафейных картак. Хтосьці з нашчадкаў колішніх ахвяраў вайны даведаўся нават аб дакладным месцы пахавання і атрымаў магчымасць наведаць гэтыя мясціны. На тэрыторыі Германіі захаваліся далёка не ўсе могілкі, аднак тыя, што ёсць, старанна даглядаюцца...».


Фота Артура СТРЭХА.

**Перадача трафейных картак на ўраджэнцаў Магілёва і Магілёўскай вобласці сваякам ваеннапалонных, якія загінулі ў нямецкім палоне.**

У мерапрыемстве, якое адбудзецца ў Віцебскім аблвыканкаме, плануецца ўдзел прадстаўнікоў аб’яднання «Саксонскія мемарыялы», германскага Чырвонага Крыжа, пасла ФРГ у Рэспубліцы Беларусь, прадстаўнікоў Народнага саюза Германіі па доглядзе воінскіх магілак. Гэта арганізацыя, дарэчы, мае прадстаўніцтва ў Беларусі.

Згодна са зробленай на пачатку года выбаркай, былі вызначаны звесткі больш як на 1,5 тысячы ўраджэнцаў Віцебска і Віцебскай вобласці. Спісы зноў шырока агучваліся, у выніку чаго адгукнуліся сваякі больш як 200 чалавек, якія пражываюць як у Беларусі, так і за яе межамі. Тыя, хто прыедзе ў Віцебск у гэту суботу, наблізяцца да праўды аб сваіх блізкіх.

На сёння Камітэт дзяржбяспекі валодае інфармацыяй больш як на 8 тысяч ваеннапалонных — ураджэнцаў усіх рэгіёнаў Беларусі, якія загінулі ў палоне. Іх спісы будуць размешчаны на сайце КДБ у 2009 годзе.

Паводле афіцыйных даных, у палоне знаходзілася звыш 4 мільёнаў чырвонаармейцаў. Зразумела, што апрацоўка велізарнай колькасці архіўных дакументаў яшчэ наперадзе.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Гучная справа

# АЎТАМАБІЛІ ВЫКРАДАЛІ, АФАРМЛЯЛІ, ПРАДАВАЛІ...

**«Таёта Лэнд Крузер», «Вольва», «Фольксваген Каравэла», «Поршэ Карэра», «Фіят Дуката»... Дзясяткаў аўтамашын пазбавіліся замежныя ўладальнікі з-за арганізаванай злачыннай групы, якая ў 2003—2004 гадах у Брэсце афармляла фіктыўныя дакументы на скрадзеныя ў краінах Еўропы экземпляры. Заказчыкамі выступалі грамадзяне як Беларусі, так і Расіі.**



Следства, якое доўжылася паўтара года, устанавіла, што на тэрыторыю краіны незаконным шляхам трапіў 51 аўтамабіль. Спрыялі гэтаму 22 чалавекі, з якіх сямёра працавалі на мытні «Заходні Буг», чацвёра — у міжраённым рэгістрацыйным экзаменацыйным аддзеле Дзяржаўтаінспекцыі Упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама, у тым ліку непасрэдна начальнік аддзела і яго намеснік.

Паколькі гаворка ішла не толькі аб афармленні дакументаў, але і аб змене нумароў кузава, нанясенні дадатковых рэльефных абазначэнняў у нумарныя знакі, а таксама аб некаторых іншых аспектах, у склад групы ўваходзілі прадстаўнікі самых розных спецыяльнасцяў — механік і адміністратар камерцыйных фірмаў, вадзіцель, урач абласной бальніцы, ахоўнік аднаго з прадпрыемстваў...

На чале групы быў загадчык гаспадарчага сектара Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанні Аркадзь Белы (імя і прозвішча зменены), які размеркаваў ролі і ступень удзелу кожнага. Ён жа даваў указанні аб змяненні ідэнтыфікацыйных нумароў кузаваў транспартных сродкаў, вырабе падробленых тэхнічных пашпартоў, фіктыўным мытным афармленні на пастах мытні «Заходні Буг» і наступнай іх рэгістрацыі ў рэгістрацыйна-экзаменацыйным аддзеле.

Пэўны час прадуманая схема дзеянняў не давала збою. Так, у кастрычніку 2003 года Аркадзь са сваім сябрам выехаў у Польшчу, адкуль вярнуўся ў той жа дзень праз пункт пропуску «Варшаўскі мост». Ён перадаў старшаму інспектару мытні «Заходні Буг» падробленыя дакументы на аўтамабіль «Фольксваген Пасат» — польскі тэхпашпарт, дагавор куплі-продажу і даверанасць, аформленую ад імя аднаго з удзельнікаў злачыннай групы. Па ўказанні галоўнага кіроўцы працэсам інспектар аформіў мытнае пасведчанне на аўтамабіль 2003 года выпуску коштам 40,8 мільёна рублёў, а таксама мытны прыходны ордэр на выплату дзяржпошліны, і паставіў у гэтых дакументах нумарную пячатку, хоць транспартны сродак знаходзіўся на мытні толькі віртуальна. Як, у прынцыпе, і падчас рэгістрацыі ў міжраённым аддзеле.

Дапамагаў «галаве» чалавек, які раней працаваў у згаданым аддзеле і быў знаёмы з многімі супрацоўнікамі. Ён хутка атрымаў дакументы аб рэгістрацыі аўтамабіля і рэгістрацыйныя нумары. Усё гэта было перададзена Аркадзю, а з яго рук — заказчыку, жыхару Бабруйска, асоба якога, праўда, не была ўстаноўлена падчас следства.

Злачынная група мела справу толькі з маладымі аўто — «узростам» да трох гадоў. Агляд такіх экземпляраў у рэгістрацыйным аддзеле рабілі, паводле распараджэння начальніка, толькі сам начальнік і яго намеснік.

Дадзеная справа ўзбуджана Упраўленнем Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Брэсцкай вобласці. Было ўстаноўлена, што дзеянні парушальнікаў закона нанеслі дзяржаве ўрон памерам 2,2 мільярда рублёў. Аўтамабілі канфіскаваныя ў даход дзяржавы. Суд Маскоўскага раёна г. Брэста прыгаварыў кіраўніка групы да 5,6 года пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Былы начальнік рэгістрацыйнага аддзела атрымаў 4 гады, яго намеснік — 3,6. Некаторым членам групы вызначана пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчыя ўстановы, іншыя былі вызвалены ад пакарання.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

